№ 9 (511) 16 сакавіка 2007 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы

# Іспыты на Дзень Волі

Чым бліжэйшы Дзень Волі, тым цікавейшы вымалёўваецца сюжэт. Піша Аляксандар Класкоўскі. Старонка 2.

**Візыт Лукашэнкі ў Кіеў адкладзены.** Па просьбе Эўрасаюзу? Старонка 6. **Вячорку выпусьцілі для Уты Цапф.** Нечаканы арышт і нечаканае вызваленьне лідэраў апазыцыі. Старонка 4. **Масавыя допыты маладафронтаўцаў.** Пяць юнакоў пераведзеныя ў ранг падазраваных. Старонка 4. **Станіслаў Шушкевіч: «Думаю, што на Дзень Волі выйдзе шмат людзей».** Былы кіраўнік Беларусі рашуча падтрымаў Мілінкевіча. Старонка 13.

## У НУМАРЫ

**Нафтавая боўтанка**

«Лукойл» спыніў пастаўкі, Лукашэнка ўзьняў акцызы. **Старонка 7.**

**Праваслаўная царква адхрысьцілася ад**

**Суворава**

Грамадзкая кампанія дала плён. **Старонка 23.**

**Рыба ў чалавечы рост**

Піша Павал Севярынец зь Сітна. **Старонка 10.**

## Веснавыя клопаты




Камунальнікі замалёўваюць графіці перад мітынгам прадпрымальнікаў 12 сакавіка. Рэпартаж зь мітынгу — «Людзі не ідуць на Бангалор» — старонка ...

# Іспыты на Дзень Волі

Чым бліжэйшы Дзень Волі, тым цікавейшы вымалёўваецца сюжэт.

Днямі свой намер быць на Плошчы засьведчылі паслы эўрапейскіх краінаў. Дарэчы, заўважце: запрасіўшы на сустрэчу Мілінкевіча, яны падкрэсьлілі, што па-ранейшаму ўважаюць яго «за галоўнага».

Ёсьць ужо і ахвотнікі прыехаць зь ліку эўрапейскіх палітыкаў, якім Мілінкевіч разаслаў запрашэньні на 25-га.

Нарэшце, шараговая палітызаваная публіка пакрысе прачынаецца.

Карацей, пайшла нейкая дынаміка.

Год таму вярхам здавалася: галоўнае — безь вялікіх скандалаў, бязь лішняга маханьня дручкамі правесьці кампанію фармальнага забесьпячэньня трэцяга тэрміну.

Тыя, хто сьцягваўся ўвечары 19 сакавіка летась да Кастрычніцкай (будучай Каліноўскага), чакалі ачапленьня, дручкоў, газу — карацей, вядомага джэнтэльмэнскага набору. Але міліцыянты прадэманстравалі атракцыён нябачанай ветлівасьці.

Адно што станцыю мэтро зачынілі: асабіста мне давялося пілаваць на цягніку да вакзалу і потым вяртацца... Урэзаўся ў памяць сюррэалістычны малюнак: на пустой плятформе «Кастрычніцкай» — бамбізы ў камуфляжы, а за іх сьпінамі па сьцяне — праектар жа працуе! — скачуць мультыплікацыйныя чэрці.

Улады скрыгаталі зубамі, але цярпелі. Наўрад ці наверсе прадбачылі, што праз год струна зноў напнецца.

Думалі: вось пасьля элегантнае перамогі ўжо расслабімся, адцягнемся! Апазыцыянэры скіснуць канчаткова, а Захад — куды ён падзенецца, хоцькі-няхоцькі будзе лічыцца з рэальным трымальнікам улады!

Але раптам рэзка зьмяніўся міжнародны кантэкст. Дый для беларускага грамадзтва, актыўнай яго часткі, Плошча не прайшла марна. Ідэйныя апанэнты рэжыму атрымалі добрае маральнае сілкаваньне. А наверсе, як бы ні храбрыліся, з халадком у вантробе адчулі сілу згуртаванай ды перакананай у сваёй маральнай перавазе грамады.

І ўсё ж на дэмакратызацыю («разбурэньне нашай палітычнай сыстэмы»), паслабленьні прэсе ці карэкцыю выбарчага заканадаўства беларускае кіраўніцтва ня хоча ісьці нават вэрбальна, імітацыйна.

Адзіны дыяпазон, у якім пакуль што магчымыя варыяцыі ўладнае палітыкі, — гэта рэпрэсіўная шкала. Трохі меней брутальнасьці, кагосьці не пасадзіць або нават выпусьціць, Дзень волі без дручкоў... Вось і ўся адліга.

Не разбэшчаная крокамі насустрач, Эўропа гатовая ацаніць нават такія подзьвігі.

Парамэтры, у якіх будзе ***дазволены Дзень Волі*** (во калямбур!), — гэта тэст для Лукашэнкі.

У такім кантэксьце болей зразумелая і звышзадача тых жэстаў, якія зрабілі сваімі лістамі да афіцыйнага кіраўніцтва Мілінкевіч, а потым група інтэлектуалаў. Жэстаў, якія максымалісты пасьпяшаліся заклеймаваць.

Але хіба палітыка апанэнтаў рэжыму мусіць зводзіцца адно да таранных дзеяньняў? І ёй ня шкодзіць быць гнуткай, а то і мець падвойнае дно.

Іншая рэч, што Дзень Волі — тэст ня толькі для кіроўных вярхоў, але і для тых, хто пазыцыянуе сябе ў амплюа палітычнае альтэрнатывы.

Мо, годзе ўжо скубціся, высьвятляючы эстэтыку налепак (з трыма сьцягамі ў адным фляконе невядомыя творцы, канечне, далі маху)?

І потым, нешта апынуліся ў цені якраз тыя партыйныя дзеячы, што ўвосень найгучней заклікалі наладзіць рэмэйк Плошчы. Ці не таму, што ў выпадку посьпеху ляўры дастануцца таму ж Мілінкевічу?

А між тым акурат час паказаць арганізатарскія таленты (вы ж дзяржавай кіраваць зьбіраецеся, хлопцы!) ды супольна зрабіць хоць адну добрую імпрэзу.

Дакангрэсіце потым.

**Аляксандар Класкоўскі**

**IN MEMORIAM**

## Іншыя мусяць устаць на яе месца



Памерла жанчына, у якой многія з вас куплялі «Нашу Ніву» ў пераходах ля ГУМу і каля вакзалу. Да апошняга тыдня свайго жыцьця яна працягвала прадаваць незалежныя выданьні. Ня толькі такія вядомыя, як «НН» і «Народная воля», але і эстэцкія, як «Партызан».

Апошнія гады, перанёсшы цяжкі інсульт, яна нядачувала, ёй цяжка было гаварыць, але яна ішла зноў і зноў з газэтамі ў пераходы. Яна не магла браць памногу асобнікаў, не магла падняць. Брала торбачку, нацягвала бурае штучнае футра, прыходзіла да нас у Рэдакцыю. Не магла націснуць на код дамафона, грукала ў шыбы.

Яе бязьлітасна ганялі работнікі органаў. Толькі нічога не маглі зрабіць з старым чалавекам.

У яе многа хто купляў газэты. Мала хто ведаў, як яе звалі: Валянціна Цюленева, дачка Васіля. Яна выгадавала сына Артура Клінава і паказала многім прыклад дзейнасьці.

Беларусь ня стала Туркмэніяй, і Расеяй ня стала, бо былі такія, як Цюленева, і яны не сядзелі, а дзейнічалі. Дзякуючы ім «Наша Ніва» зрабіла беспрэцэдэнтнае ў беларускай гісторыі: ужо паўтара году разыходзіцца, нягледзячы на забарону.

Яна памерла ў адзін дзень з Жанам Бадрыярам, дэканструктарам мэдыйнае маніпуляцыі.

Калісьці ў гэтым пераходзе ўстане помнік: бабулька трымае газэты. Гэта будзе помнік усім, хто заваёўвае свабоду слова. Безь якой нічога ня можа стаць.

Месца Цюленевай не павінна застацца пустым.

**Андрэй Дынько**

## Анталёгія «Жанчыны выходзяць з-пад кантролю: беларускае жаночае апавяданьне».




У зборнік увайшлі творы найлепшых сучасных аўтарак: Наталкі Бабінай, Вольгі Бабковай, Тацьцяны Барысік, Марыі Вайцяшонак, Евы Вежнавец, Марыі Роўды ды іншых. Сьціплая і прынцыповая, шчырая і пасьлядоўная кніга пра тое, як быць жанчынай у Беларусі — з прадмовай Іны Кулей.

Выдатны падарунак да ўсіх вясновых сьвятаў.

## Пётра Рудкоўскі. Паўстаньне Беларусі

«Пётра Рудкоўскі мне нагадвае Максіма Багдановіча — і першы, і другі адразу па прыходзе ў беларускае пісьменства (першы — у прыгожае, а другі — ужо ў інтэлектуальнае) радыкальна зьмянілі яго стыль і занялі ў ім вядучыя пазыцыі.

Як талент Багдановіча, талент Рудкоўскага чысты і ясны. Пётра — чалавек высокай духоўнасьці і сумленнасьці. У галіне гуманістыкі гэта значыць, што для яго няма забароненых тэмаў ды табуяваных постацяў».

З прадмовы Валера Булгакава







## Андрэй Хадановіч. Сто лі100ў на tut.by

Новая кніга паэта, якога няма патрэбы прэзэнтаваць.

## Андрэй Дынько, Андрэй Скурко. Беларусь за 10 падарожжаў

«Гэта кніга падарожных эсэ, але аўтараў мала цікавяць помнікі культуры і прыроды ў звыклым значэньні гэтага слова. Калі гэта й турызм, то антрапаэтнатурызм. Аўтараў цікавяць насельнікі нашага часу, культурныя зьявы, дыялекты быцьця. Тое, што хвалі гісторыі, а часам і яе разец, фармавалі стагодзьдзямі і што можа зьнікнуць за дзесяцігодзьдзе ўніфікаванае тэлевізійнае культуры.

Кніга складзеная так, каб чытачу лягчэй было праехаць тымі самымі маршрутамі, толькі гэта ня кніга-шпаргалка, а кніга-падказка. Сваю Беларусь няхай кожны напіша сам».

З прадмовы да кнігі






**Печанко, С.**
**У беларускім войску: Падарунак прызыўніку.** — Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2007. — 72 с.

## Сямён Печанко. У Беларускім войску. (Падарунак прызыўніку)

Кніга — адмысловы падручнік для хлопца, што зьбіраецца ісьці ў войска, маючы ў сабе запал беларушчыны. Папярэджаны — значыцца ўзброены.

З прадмовы Сяргея Балахонава



# Вячорку выпусьцілі для Уты Цапф

Увечары 13 сакавіка былі затрыманыя палітыкі Вячаслаў Сіўчык і Вінцук Вячорка.

Управу БНФ блякавалі людзі ў цывільным. Вінцуку Вячорку ўдалося зьехаць дахаты, але яго затрымалі ля дзьвярэй уласнае кватэры, прыкладна а 22-й. Ён пасьпеў тольки перадаць сыну Франаку малодшую дачку Ружану, якая была зь ім пасьля школы.

Жонка сп.Вячоркі Арына перажыла трывожныя гадзіны. Варта нагадаць, што толькі тыдзень таму старшыня Аргкамітэту сьвяткаваньня Дня Волі пахаваў бацьку Рыгора, праз што вымушаны быў перарваць візыт у ЗША, дзе ён перабываў у складзе апазыцыйнай дэлегацыі.

Сіўчык быў затрыманы дзьвюма гадзінамі раней, пасьля 20-й, на плошчы Якуба Коласа.

У цэнтры гораду скрозь можна было бачыць незвычайную колькасьць патрулёў спэцназаўцаў у плямістай форме. Такое ўражаньне, што іх перавялі на ўзмоцнены варыянт нясеньня службы. Гэта нагадвала сакавік мінулага году, калі былі прынятыя надзвычайныя захады, каб паралізаваць распаўсюд улётак.

Усю сераду чакалі суду. Каля Акрэсьціна дзяжурылі журналісты і праваабаронцы. Ад ранку да пошукаў палітыкаў далучыліся супрацоўнікі місіі АБСЭ. Усе чакалі, што, як і летась у сакавіку, палітыкаў чакае беспардонны прысуд. Аднак, увечары у Сіўчыка і Вячорку выпусьцілі гэтак жа нечакана, як і затрымалі.

В.Вячорку абвінавачваюць у тым, што ён «лаяўся ў пад'езьдзе ўласнага дому», а В.Сіўчыка — яшчэ і ў тым, што ён спраўляў натуральную патрэбу на праспэкце Скарыны. Выпусьцілі ж таму, што, нібыта, міліцыянты няправільна афармілі пратаколы.

В. Вячорка сказаў, як зьвязаў, чаму яго гэтак затрымалі і вызвалілі. «Мяне хапалі ў мінулым годзе, за 11 дзён да прэзыдэнцкіх выбараў 19 сакавіка. І цяпер таксама арыштавалі роўна за 11 дзён да Дня Волі. Думаю, што міжнародная рэакцыя сыграла сваю ролю. Цяпер я даведаўся, што ў Менск прыехала Ута Цапф — праводзіць сэмінар з уладамі. Значыць, мяне часова выпусьцілі для Уты Цапф».

Аляксандар Мілінкевіч заявіў, што ніякія запалохваньні не павінны мяняць плянаў Дэмакратычных сілаў на 25 Сакавіка.

**СП**

**Вызваленьне В.Вячоркі азначае, што адбудзецца прызначаная на пятніцу, 14.00, он-лайн-канфэрэнцыя зь ім на сайце nn.by.**

# Масавыя допыты маладафронтаўцаў

У дачыненьні да трох актывістаў арганізацыі заведзеная крымінальная справа, каля сарака чалавек дапытаў КДБ.

12 сакавіка актывісты незарэгістраванага «Маладога фронту» Наста Палажанка ды Аляксей Янушэўскі, а 14 сакавіка – Барыс Гарэцкі, былі перакваліфікаваныя са сьведкаў ў падазраваных. Ім закідаецца ўсё той жа арт. 193-1 (удзел у незарэгістраванай арганізацыі). Справу вядзе сьледчы менгарпракуратуры Сяргей Грахоўскі.

На працягу трох апошніх дзён супрацоўнікі пракуратуры і КДБ праводзяць допыты актывістаў. На гутаркі «маладафронтаўцаў» запрашалі ў Менску, Горадні, Магілёве, Жлобіне, Мастах, Берасьці, Воршы, Віцебску.

У Мастах маёр КДБ дапытаў дэпутата мясцовага Раённага савету Зьмітра Кухлея.

У Магілёве на допыт у КДБ выклікалі сем чалавек, сярод іх Артур Фінькевіч, які адбывае пакараньне ў мясцовай спэцкамэндатуры.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Наста Палажанка (у цэнтры) патрабавала вызваленьня Дашкевіча.**




**Ператрус у Гарэцкіх. Фота зробленае мабільным тэлефонам з вуліцы. Пад вокнамі кватэры ўвесь час вобшуку дзяжурылі праваабаронцы і журналісты.**




**Барыс Гарэцкі (зьлева) і Аляксей Янушэўскі.**

Варта адзначыць, што ў Горадні супрацоўнікі спэцслужбаў спасылаліся на сьпіс сябраў абласной арганізацыі, сканфіскаваны пры ператрусе на кватэры Палажанкі. Амаль паўсюль у «маладафронтаўцаў» выпытвалі агульныя зьвесткі пра арганізацыю. Юнакі пэўныя, што рэзкае паскарэньне справы зьвязанае з акцыямі, заплянаванымі на 19 і 25 сакавіка.

На думку Аляксея Янушэўскага, такім чынам улады спрабуюць запалохаць моладзь, што яшчэ ня вызначылася наконт вясновых масавых акцыяў, а таксама бацькоў, каб тыя трымалі дзяцей дома.

Такім чынам, ужо пяць сяброў незарэгістраванага «МФ» праходзяць як падазраваныя: Наста Палажанка, Аляксей Янушэўскі, Алег Корбан, Барыс Гарэцкі і Зьміцер Хведарук. Хведарука таксама ў сераду дапытвалі зноў.

«Прад'яўлялі касэты з праслухоўваньнем паседжаньня рады ў кватэры 4 сакавіка, паказалі раздрукоўку, хто што казаў — у ролях, як у спэктаклі. То бок праслухоўвалі даволі добра, і як высьвятляецца з папярэдніх допытаў, праслухоўвалі ня толькі 4-га, але і раней», — сказаў ён.

**Сямён Печанко**

## КАМЭНТАР РЭДАКЦЫІ

Улады хочуць прадэманстраваць жалезную пасьлядоўнасьць. «Так было і так будзе», як казаў царскі міністар унутраных справаў Макараў пасьля Ленскага расстрэлу.

Патэнцыйных лідэраў маніфэстацыі затрымліваюць прэвэнтыўна, як перад выбарамі летась. Загадзя, каб запалохаць патэнцыйных удзельнікаў. Гэта амаль напэўна азначае, што 25-га, перад тэлекамэрамі, усё будзе як найцішэй.

Маладафронтаўцаў хочуць прымусіць спыніць дзейнасьць. Яны не скараюцца, хоць лічба крымінальных справаў ідзе на дзясятак. Што таксама стане гістарычным прэцэдэнтам.

Выявілася патрабаваньне Праляскоўскага выдаліць з падручнікаў беларускай літаратуры ужо не паасобных творцаў, але самы выраз «нацыянальнае адраджэньне».

Вылез законапраект пра ахову інфармацыі, якім, найхутчэй, будзе ўведзеная цэнзура Інтэрнэту.

Рэакцыя Лукашэнкі на Дзень Волі выяўляе цалкам яго «незалежніцтва».

Пасланьне ўладаў: бюракратычна-сілавая машына будзе працаваць у ранейшым рэжыме. Супраціўленьне бессэнсоўнае. Маштаб акцый пратэсту будзем зьмяншаць ад разу да разу пасьлядоўнымі прэвэнтыўнымі мерамі.

Сьвет праінтэрпрэтуе арышты інакш: у Лукашэнкі здалі нэрвы, ён баіцца маніфэстацый, ён адракаецца заходняга вэктару, ён зарабляе расейскі крэдыт, кароткая палітычная адліга скончылася; апазыцыя ж не скараецца і нават — як маладафронтаўцы — праяўляе гераізм.

# Візыт Лукашэнкі ў Кіеў адкладзены

Кіраўніца прэс–службы ўкраінскага прэзыдэнта Ларыса Мудрык заявіла «НН», што на дадзены момант візыт пакуль не плянаваўся, аднак над пытаньнем сустрэчы двух прэзыдэнтаў працуе рабочая група.

6 сакавіка прэзыдэнт Украіны Віктар Ючшанка заявіў, што праз тыдзень у яго зь візытам будзе Аляксандар Лукашэнка. Аднак праз тыдзень гэты візыт не адбыўся. Лукашэнка гэтымі днямі адпачывае ў Сочы, а Ючшанка на гэтым тыдні браў удзел ва ўрачыстасьцях з нагоды дня нараджэньня Шаўчэнкі й накіроўваецца ў Данію.

Кіраўніца прэс-службы ўкраінскага прэзыдэнта Ларыса Мудрык заявіла «НН», што на дадзены момант візыт не плянаваўся, аднак над пытаньнем сустрэчы двух прэзыдэнтаў працуе рабочая група, якая і мусіць вызначыць дату сустрэчы. «Калі прыкладна яна адбудзецца, пакуль рана гаварыць», — адзначыла яна.

Меркавалася, што Ўкраіна можа стаць пасярэднікам у перамовах Беларусі з Захадам. Ёсьць вэрсія, што сустрэча Лукашэнкі зь Ючшанкам адкладзеная на просьбу эўрасаюзаўскай дыпляматыі да 25 Сакавіка. Ход маніфэстацыі можа засьведчыць, наколькі беларускі ўрад гатовы суцішыць рэпрэсіі супраць іншадумцаў і гэтак выканаць умову Захаду для дыялёгу.

Другую вэрсію адкладу агучылі маскоўскія палітолягі: афіцыйны Менск чакае адказу ад расейскага боку датычна крэдыту і таму не зацікаўлены болей у візыце ва Ўкраіну.

**Зьміцер Панкавец**

# Мілінкевіч: «Дыялёг Беларусі з Эўропай пакуль немагчымы»

Лідэр апазыцыі сустракаўся з дэлегацыяй вярхоўнага камісара ЭЗ у пытаньнях замежнай палітыкі і бясьпекі Хавіера Саляны. У склад дэлегацыі ўваходзілі Хельга Шміт і Пірка Тапіёла, супрацоўнікі офісу Саляны.

Галоўнай тэмай сустрэчы сталася пытаньне ўзаемадачыненьняў паміж Беларусьсю і Эўразьвязам. Мілінкевіч зьлёгку скрытыкаваў палітыку Эўропы ў дачыненьні да афіцыйнага Менску. Ён сказаў, што Эўропа часам магла б быць больш рашучай.

Мілінкевіч перакананы, што дыялёг між беларускімі ўладамі і Эўропай можа адбыцца толькі пасьля таго, як афіцыйны Менск выканае ўсе патрабаваньні Эўразьвязу. «Трэба верыць рэальным справам, а не пустым запэўніваньням», — адзначыў Мілінкевіч.

Шміт і Тапіёла ў сваю чаргу запэўнілі, што эўрапейская супольнасьць зь вялікай цікавасьцю будзе сачыць за падзеямі ў Менску 25 Сакавіка. Менавіта ад гэтага дня ў многім і будзе залежыць далейшая палітыка ЭЗ да Беларусі. Дыпляматы таксама заклікалі беларускую апазыцыю як мага хутчэй пераадолець разлад і рэальна аб'яднацца.

Неўзабаве пасьля вяртаньня дэлегацыі зь Менску Саляна заявіў, што бачыць «некаторыя магчымасьці наладзіць ці распачаць пэўныя адносіны з Лукашэнкам, з Беларусьсю».

Карэспандэнт радыё «Свабода» ў Брусэлі са спасылкай на дыпляматычныя крыніцы перадае, што візыт прадстаўнікоў Хавіера Саляны адбыўся пасьля кантактаў паміж вярхоўным прадстаўніком Эўразьвязу ў пытаньнях замежнай палітыкі і бясьпекі і беларускім міністрам замежных справаў Сяргеем Мартынавым.

**Зьміцер Панкавец**

# Пастаялку хавалі з вайсковымі ўшанаваньнямі

Уначы на 7 сакавіка, пасьля доўгай цяжкой хваробы, памерла Людміла Пастаялка — старшыня камісіі Савету рэспублікі па дэмаграфічнай бясьпецы і сацыяльным разьвіцьці, экс-міністарка аховы здароўя Беларусі, маці галоўнае доктаркі Рэспубліканскай больніцы ўпраўленьня справамі прэзыдэнта Ірыны Абельскай.

Нэкралёг надрукавалі ўсе дзяржаўныя газэты. На разьвітаньне зь ёю прыбылі ўсе першыя асобы дзяржавы, ад Сідорскага пачынаючы.

Аляксандар Лукашэнка і ягоныя сыны на разьвітаньні не прысутнічалі. Кіраўнік краіны адпачывае ў Сочы.

Назіральнікі дзіваваліся таму, што Пастаялку хавалі з вайсковай вартай — звычайна так хаваюць толькі вайскоўцаў. Незвычайны ўзровень пахаваньня тлумачаць нефармальным уплывам яе дачкі.

**МБ**

# Рух «За свабоду» пайшоў у рост

У розных раёнах Беларусі праходзяць паседжаньні актывістаў дэмакратычнага руху, на кожным такім паседжаньні дэкляруецца пра стварэньне мясцовай суполкі руху «За свабоду».

На выходных адбылося паседжаньне дэмакратычнай грамадзкасьці Маладачаншчыны (Маладэчна, Валожын, Мядзел, Вялейка, Смургоні). Прысутныя на ім выказаліся супраць правядзеньня бліжэйшым часам Кангрэсу дэмакратычных сілаў, а таксама падтрымалі Мілінкевіча. На сустрэчы прысутнічалі сябры ПБНФ, АГП, беспартыйныя.

Падобнае ж паседжаньне 4 сакавіка адбылося ў Івацэвічах. На сустрэчы прысутнічала 27 чалавек — ад усіх партый, акрамя камуністаў. Яны прынялі пастанову, у якой лічаць, што надалей мусіць мець сілу першы Кангрэс дэмакратычных сілаў. Гэтай вясной івацэвіцкія дэмакраты заклікаюць правесьці сэсію першага Кангрэсу, дзе прапануюць заслухаць справаздачу кіраўнікоў апазыцыі, а таксама прыняць стратэгію дэмакратычных сілаў.

Заклікаюць згуртавацца вакол руху «За свабоду» і прадстаўнікі Віцебшчыны. Мясцовыя дэмакраты засьведчылі гэта 4-5 сакавіка, калі Мілінкевіч зрабіў аб'езд Віцебшчыны.

**ЗП**

# Акцызы на аўтамабільнае паліва падвоеныя

У 2,4 раза вырасьлі стаўкі акцызаў на аўтамабільнае паліва. Адпаведны ўказ падпісаў А. Лукашэнка. Указ матывуе падвышку мэтамі «забесьпячэньня эфэктыўнае працы нафтаперапрацоўчае галіны». Гэтыя сродкі ўрад мае накіраваць на даплаты нафтавым кампаніям, якія будуць перапрацоўваць нафту на беларускіх заводах на давальніцкіх умовах з далейшым рээкспартам. Прыплата мае скласьці 24 даляры за кожную тону.

Ад пачатку году загрузка нафтаперапрацоўчых заводаў была ніжэйшаю за звычайнаю праз нізкую прыбытковасьць паставак з Расеі на новых умовах.

Рост акцызаў напэўна прывядзе і да чарговага павышэньня раздробных цэнаў на бэнзын і салярку.

**МБ**

# «Лукойл» прыпыніў пастаўкі нафты ў Беларусь

Няпэўнасьць на беларускім рынку нафтаперапрацоўкі прымусіла расейскую нафтавую кампанію «Лукойл» адрачыся падпісаньня кантрактаў на пастаўку ў сакавіку сыравіны на давальніцкай аснове на беларускія нафтаперапрацоўчыя заводы. Прычына — брак ясных правілаў працы на рынку нафтапрадуктаў не дазваляе пралічыць выгаднасьць перапрацоўкі нафты за люты гэтага году. Кантракт на звычайны продаж не скасоўваецца.

Ня выключана, што такое ж рашэньне могуць прыняць іншыя буйныя пастаўшчыкі.

# Эўропа пераходзіць на энэргаашчадныя лямпачкі

Усе лямпачкі, нават у прыватных кватэрах, мусяць быць замененыя на энэргаашчадныя. Такое рашэньне прынялі кіраўнікі эўрапейскіх дзяржаваў на саміце ў Брусэлі. Ужо ў 2008 годзе мусяць быць замененыя лямпы напальваньня на прадпрыемствах і ў публічных месцах. Адносна прыватнага жытла адпаведнае заканадаўства мусіць быць прынятае не пазьней за 2009 год.




Сярод іншых захадаў, абавязковых для ўсіх краінаў, — выпрацоўка як мінімум дваццаці працэнтаў усёй электраэнэргіі з узнаўляльных крыніцаў (энэргія вады, паветра, сонца і да т.п.). Гэты парог мусова дасягнуць да 2020 году.

Гэта частка вялікага пляну эўрапейцаў па зьмяншэньні спажываньня энэргіі. Навукоўцы ўжо назвалі гэты плян «трэцяй прамысловай рэвалюцыяй».

У Беларусі энэргаашчадныя лямпачкі не вырабляюцца. Дарагія, імпартаваныя з Польшчы ці Кітаю, яны, тым ня менш, апраўдваюць сябе, бо спажываюць у пяць разоў меней электрычнасьці, чым звычайныя, для выпрацоўкі сувымернай колькасьці сьвятла.

**МБ**

# Беларусь скасавала канвой грузаў з Калінінграду

Мытны камітэт Беларусі ў сераду 7 сакавіка з 22:00 адмяніў канваяваньне калінінградзкіх грузаў. Як паведаміла прэс-служба мытні, «між Беларусьсю й Расеяй урэгуляваныя ўсе спрэчныя пытаньні транзыту грузаў з Калінінградзкай вобласьці ў вялікую Расею». Цяпер «грузы бесьперашкодна й без канвою змогуць перасякаць тэрыторыю Беларусі», як абяцае мытня.

Працэдура нагляду й канваяваньня калінінградзкага транзыту была ўведзеная ў студзені гэтага году ў шэрагу захадаў у адказ на рост цэнаў на энэрганосьбіты.

Скасавалі канвой пасьля таго, як Расея прыгразіла спыніць у адказ дазволы на дзейнасьць беларускіх перавозчыкаў на сваёй тэрыторыі.

**МБ**

# Спынілася вытворчасьць на ўсіх цукроўнях

На ўсіх чатырох цукровых камбінатах Беларусі прастой. 13 сакавіка дэлегацыя на чале зь віцэ-прэм'ерам Іванам Бамбізам выправілася ў Маскву, каб падпісаць пагадненьне пра пастаўкі беларускага цукру на расейскі рынак у 2007—2008 г.

У мінулыя гады беларускія цукровыя камбінаты пастаўлялі ў Расею ад 400 да 450 тысяч тон цукру. У студзені на перамовах у Маскве прынялі кампрамiснае рашэньне пра абмежаваньне паставак беларускага цукру ў Расею ўзамен на нізкія цэны пастаўкі нафты. Беларусь мае абмежаваць пастаўкі цукру ў Расею ў 2007 годзе — да 180 тысяч тон, а ў 2008-м — да 100 тысяч.

**МБ**

Мітынг прадпрымальнікаў: вынікі і высновы. Піша **Зьміцер Панкавец**.

# Людзі не ідуць на Бангалор

Надвор’е ўсяляк спрыяла, каб мітынг прадпрымальнікаў прайшоў як мага больш масава. Аднак ужо на падыходзе да Бангалору стала зразумела, што шмат людзей сёньня ня выйдзе.

Першы, каго я заўважыў на плошчы, быў адзін зь лідэраў незарэгістраванага «Маладога фронту» Зьміцер Хведарук. Пытаюся, чаму няма сьцягоў. Хведарук цісьне плячыма — нельга, «сам разумееш: прадпрымальнікі». Хведарук сказаў, што, праяжджаючы нядаўна ля плошчы Якуба Коласа, дзе ад пачатку мелася прайсьці акцыя, пабачыў, што там людзей ня меней, чым на Бангалоры. А 12.00 мітынг яшчэ ня думаў пачынацца. Не было электрычнасьці. Толькі на сцэне стаяў экс-палітвязень Сяргей Скрабец з партрэтам Аляксандра Казуліна. Мэгафона таксама ў пару не знайшлося.

Адзін зь лідэраў прадпрымальніцкага руху Аляксандар Макаеў гаварыў безь мікрафона, што трэба троху пачакаць, пакуль «нашы людзі дамовяцца ў «Менэнэрга» пра электрычнасьць. Праз нейкі час прынесьлі мэгафон. Міліцыі практычна не было. Толькі за сцэнай дзяжурыла пара АМОНаўцаў, а ў натоўпе хадзіла колькі чалавек у цывільным з рацыямі. На пляцы было недзе сто чалавек, пасьля падышло яшчэ троху, усяго было каля двухсот. Прадпрымальнікаў — добра калі была палова.

Пакуль мітынг не пачынаўся, людзі бавілі час на сонейку, размаўлялі між сабой. Да мяне падышоў таксіст, які сказаў, што хоць і ня мае наёмных рабочых, але хоча, каб такія зьявіліся, а ўказ абмяжоўвае гэтую магчымасьць. Тым часам моладзь раздавала газэты «Выбар», «Новы час», а таксама дыскі зь фільмам «Плошча».

Уласна мітынг пачаўся у 12.50. Апроч аднаго сьцяга Менску, ніякай сымболікі на Бангалоры не было. Транспарантаў і расьцяжак таксама было вобмаль.

Мітынг пачалі прадстаўнікі рэгіёнаў, якія заклікалі адмяніць дзеяньне ўказу прэзыдэнта №760. Нагадаем, што паводле гэтага ўказу прадпрымальнікі ня маюць права прымаць на працу не сваякоў.

Прадпрымальніца з Рагачова Ала Гурэвіч сказала, што ёй сорамна за менскіх дробных гандляроў, якія не прыйшлі падтрымаць акцыю. Яна ж заклікала зьвярнуцца з просьбай адмяніць гэты ўказ да «гаранта нашай Канстытуцыі». З натоўпу зараўлі, што ён ня ёсьць гарантам «нашай» Канстытуцыі.

Прадстаўніца Беларускага саюзу прадпрымальнікаў Кацярына Чыжык сказала, што прадпрымальнікі мусяць працягваць высоўваць эканамічныя лёзунгі. З натоўпу ізноў пачалі парыраваць: а палітычныя? Адказу на гэтае пытаньне не прагучала.

Увогуле, самі прадпрымальнікі не выстаўлялі ніякіх палітычных патрабаваньняў, абмяжоўваліся эканамічнымі. Лідзія Сітава заклікала дабівацца асабістай сустрэчы з прэзыдэнтам, каб «паспрабаваць зь ім дамовіцца».

Пэнсіянэр Алег Гаеўскі перадаў тым, хто сабраўся на плошчы, прывітаньне ад



PHOTOBYMEDIA.NET

народнага пісьменьніка Беларусі Ніла Гілевіча.

Прадпрымальнікі казалі, што ўвядзеньне ў сілу ўказу №760 пакіне бяз працы прыкладна 300 тысячаў чалавек, што ён набліжае нас да Паўночнай Карэі, што такім чынам улады лабіруюць інтарэсы буйнага бізнэсу і спрабуюць задушыць сярэднюю клясу, якая толькі-толькі пачынае нараджацца ў Беларусі. Але разам з тым узьнікала пытаньне: чаму на пляцы так мала саміх прадпрымальнікаў? У нейкай ступені адказ на гэтае пытаньне даў Аляксандар Макаеў, які адзначыў, што самі прадпрымальнікі яшчэ да канца не разумеюць сэнс і пэрспэктыву гэтага ўказу.

У другой частцы троху паболела палітыкі, найперш дзякуючы выступам лідэраў палітычных партыяў — Вінцука Вячоркі і Анатоля Ляўковіча. Вячорка тлумачыў, што выкананьне 12 патрабаваньняў Эўракамісіі палегчыць жыцьцё і прадпрымальнікам. Ужо пасьля Ігар Леднік і Вячаслаў Сіўчык заклікалі распачаць збор подпісаў за тое, каб Беларусь стала сябрам Рады Эўропы.

Пры канцы мітынгу прынялі рэзалюцыю, якая, апроч эканамічных патрабаваньняў, заклікае да вызваленьня палітвязьняў, годнае адзначэньне 125-годзьдзя Купалы і Коласа, а таксама ўшанаваньне памяці ахвяраў сталінскіх рэпрэсіяў. Рэзалюцыя была прынятая аднагалосна. Пасьля чаго пачаўся канцэрт барда Зьмітра Бартосіка.

Прадпрымальнікі кажуць, што гэта была толькі рэпэтыцыя агульнанацыянальнага страйку 25 Сакавіка. Цяжка адназначна адказаць, ці шмат прадпрымальнікаў выйдзе на плошчу на Дзень Волі, бо з трыбуны амаль не гучала ніякіх лёзунгаў падтрымаць акцыю пратэсту. Прадпрымальнікі ўсё чакаюць.

# Сяргей Скрабец: «Пра гэта самае мне казаў Казулін»

Арганізатар акцыі на «дзень яднаньня Беларусі і Расеі» Сяргей Скрабец: «Гэта дакор уладам і апазыцыі, якія аб'ядналіся ў антырасейскай палітыцы». Генэрал Фралоў: «На жаль, наша прапанова сутыкнулася зь неразуменьнем, асабліва з боку маладзейшых».

**Сяргей Скрабец наладжваў кантакты з расейскімі палітыкамі ад 2002 году.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Былыя дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Валеры Фралоў і Сяргей Скрабец 12 сакавіка падалі ў Мингарвыканкам заяўку на правядзеньне шэсьця ў гонар Дня яднаньня народаў Беларусі і Расеі 2 красавіка. Палітыкі папрасілі ў Мингарвыканкаме дазволу на шэсьце ад Палацу Рэспублікі да парку імя Горкага і сьвяточны канцэрт у самім парку.

Сяргей Скрабец наступным чынам пракамэнтаваў гэтую падзею: «Галоўная мэта акцыі 2 красавіка — спыніць гэтую палітыку вайны, якую вядзе беларуская ўлада з братняй нам Расеяй. У нашых народаў ня мусіць быць дрэнных адносінаў, нашы народы не павінны пакутаваць ад таго, што кіраўнікі дзяржаваў ня могуць дамовіцца між сабой. Я лічу, што правядзеньнем гэтай акцыі мы выкажам дакор і беларускай апазыцыі, якая фактычна аб'ядналася з уладай у антырасейскай палітыцы. Я лічу, што на дадзены момант не існуе пагрозы беларускай незалежнасьці, а існуе пагроза лукашызму. Пра гэта самае ў турме казаў мне і Аляксандар Казулін. Мы мусім сябраваць з Расеяй, для таго і ладзіцца гэтая акцыя».

Выказаўся на гэты конт і генэрал Валер Фралоў: «Нам проста трэба разабрацца, ці было насамрэч аб'яднаньне, трэба высьветліць урэшце, што нас аб'ядноўвае, а што разьядноўвае. Расея заўсёды аказвала дапамогу Беларусі, прычым рабіла гэта сыстэмна і рэгулярна, у адрозьненьне ад ЗША ці Эўропы. Бяда ў тым, што беларускія ўлады ня могуць эфэктыўна скарыстацца з гэтай дапамогі. У мяне зьявілася адчуваньне, што ў Расеі пачынаюць мяняцца погляды на Беларусь. Расеі ў выглядзе Беларусі патрэбны моцны і незалежны хаўрусьнік, а не краіна зь непрадказальным кіраўніком. Мне сьмешна, калі цяпер пачынаюць крычаць, што Расея мае нейкія імпэрскія амбіцыі і ўсё такое. Я думаю, што замежная палітыка гэтай краіны становіцца з кожным годам усё больш прадуманай і глыбокай. Нас аб'ядноўвае супольная гісторыя, эканоміка і багата што яшчэ. Учора я тэлефанаваў некаторым сябрам-палітыкам у Расеі, яны згодныя падтрымаць нашу ініцыятыву, але пакуль рана называць нейкія прозьвішчы. Наша акцыя ня ёсьць дакорам працы так званай «традыцыйнай апазыцыі», у ёй таксама шмат разумных і разважлівых хлопцаў. Наша акцыя не спадабаецца хіба што толькі пэўным правадырам апазыцыі, якія, я лічу, не да канца самастойныя ў сваёй палітыцы. Я размаўляў зь Ляўковічам і Ўхналёвым, дык яны схіляюцца, каб падтрымаць нас 2 красавіка. Ніякіх новых прарасейскіх рухаў ня будзе, яны проста ўжо ўсім надакучылі. І я ствараў багата рухаў, і Мілінкевіч стварае, і Лябедзька. Толку ад іх мала, таму нічога новага ствараць ня будзем. Пакуль цяжка сказаць, наколькі масавай будзе гэтая акцыя, але праца па гэтым накірунку вядзецца. Дакладна скажу, што будуць прынагодныя налепкі і ўлёткі. Разам з тым, на жаль, мушу канстатаваць, што шмат у каго, асабліва з маладзейшых, наша прапанова сутыкнулася зь неразуменьнем, але будзем працаваць і зь імі».

**Зьміцер Панкавец**



**Павал Севярынец** — у 1998—2004 лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту». Асуджаны за арганізацыю акцыяў пратэсту пасьля рэфэрэндуму 2004 году. Цяпер у высылцы ў Малым Сітне, на поўначы Полаччыны.

ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ

# Рыба ў чалавечы рост

У тую большую частку году, калі ў сіценскіх лясох няма ані грыбоў, ані ягадаў, ані шышак, што здаюць тутэйшаму лясьніцтву *на семяно*, у паспалітага люду застаецца толькі адзіны занятак, цікавы й прыбытковы адначасова. *Рыба*. Бліскучыя манэткі лускі праблісківаюць то ў траве, то ў вопратцы, то ў валасох; зімою лёд на кожнай сажалцы ў лунках; штодня размовы пра тое, ці *бярэцца*. Мой кот Партызан можа пацьвердзіць, што пах сьвежае рыбы канкуруе ў Сітне хіба што з пахам драўніны ды перагарам.

Сітна — месца рыбнае. Вакол лясныя азёры, рэчкі, сеткі пратокаў, ціхіх ды глыбокіх, — тысячу гадоў таму па Палаце ішла адна з галінак шляху «з варагаў у грэкі». Ловяць шчупака, ляшча, акуня, ліня; бывае, заходзіць зь Дзьвіны судак. У азёрах шыюцца ў глей залатыя карасі — вялізныя, памерам на патэльню. І хоць посту тут не трымаюць, рыба перад Калядамі ды пасьля Масьленіцы на стале часьцей за якое мяса.

Чым ловяць? Вядома, вуда тут — забаўка хіба што для дзяцей ды «дзеля душы» (калі галоўнае — сам працэс). Гарадзкія, што прыяжджаюць адпачываць з Полацку, зазвычай бяруць з сабою сьпінінг. Найбольш жа пашыраная снасьць — сеткі розных гатункаў. Нераты, крыгі, брaднікі, «павукі». Бывае, грабуць так, што вада па Палаце сплывае ажно чорная. А калі глушаць электравудай ці выбухоўкай — ад белае лускі рабаціць уваччу. Падчас нерасту перагароджваюць гарлавіны пратокаў… Словам, браканьерства квітнее. Для любога прыхадня спроба памыць боты ў возеры ля вёскі можа скончыцца руляй паляўнічай стрэльбы з хмызьняку і камандай: «Ану, стаяць, рукі ўгору! Ты сеткі ставіў, што іх вымаць лезеш?!».

Мясцовыя мужыкі згадваюць рыбалоўныя наезды ў Расею, аддзеленую ад Беларусі толькі квартальнай прасекай, ды клянуць дзікасьць тамтэйшых інспэктараў («грошай

## ХРОНІКА

### 3 сакавіка

### Дзянісу Дзянісаву пагражае да трох гадоў зьняволеньня

Актывісту незарэгістраванай арганізацыі «Бунт» **Дзянісу Дзянісаву** пагражае да трох гадоў пазбаўленьня волі. Са словаў Дзянісавага адваката **Пётры Каваленкі**, хлопца вінавацяць паводле **арт.342** (арганізацыя масавых беспарадкаў, што парушаюць грамадзкі парадак).

Адвакат кажа, што падзеі, якія фігуруюць у справе Дзянісава, адбыліся 18 чэрвеня 2006 г. у Віцебску. Тады група моладзевых актывістаў зь незарэгістраванай арганізацыі «Бунт» спрабавала правесьці апазыцыйную акцыю. Актывісты вывесілі бел–чырвона–белы сьцяг.

Крымінальную справу з нагоды ўдзелу Дзянісава ў гэтым эпізодзе завялі летась у кастрычніку. А затрымалі Дзяніса 16 лютага ў цягніку, што ехаў у Гомель. Спачатку актывіста трымалі ў Гомельскім сьледчым ізалятары, потым перавезьлі ў Віцебскі сьледчы ізалятар №2.

### 5 сакавіка

### Бяз права на амністыю

Адміністрацыя шклоўскай турмы вынесла палітвязьню **Зьмітру Дашкевічу** чацьвёртае папярэджаньне. Гэтым разам — за тое, што ён чытаў пасьля адбою. Пра гэта стала вядома зь ліста Зьмітра да бацькоў. А паводле заканадаўства гэта азначае, што ў Дашкевіча няма шанцаў выйсьці на волю пасьля абвяшчэньня амністыі. Цяпер ён лічыцца злосным парушальнікам турэмнага рэжыму, які ня стаў на шлях выпраўленьня.

За кратамі малады чалавек ужо шэсьць месяцаў.

### 6 сакавіка

### Левыя судзяцца зь Мін’юстам

Падчас паседжаньня Цэнтральнай рады **Саюзу левых партыяў**, у які ўваходзяць **Беларуская партыя жанчын «Надзея»**, **Партыя камуністаў беларуская** і **Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада)**, прадстаўнікі партыяў вырашылі зьвярнуцца ў Вярхоўны суд Беларусі са скаргай на **Міністэрства юстыцыі** за адмову ў рэгістрацыі Саюзу.

Мін’юст вінаваціць левых у тым, што тыя ладзілі ўстаноўчы сход новай арганізацыі ва Ўкраіне, а не на тэрыторыі Беларусі.

Акрамя таго, кожная з трох партыяў атрымала афіцыйнае папярэджаньне за ўдзел ва ўстаноўчым сходзе. Першымі абскардзілі гэтае рашэньне камуністы.

### 7 сакавіка

### Казуліну скасавалі адмысловы рэжым выхаду з галадоўкі

Адвакат **Ігар Рынкевіч** сустрэўся 7 сакавіка са сваім падабаронным, экс–кандыдатам на прэзыдэнта **Аляксандрам Казуліным** у віцебскай калёніі №3. Са словаў адваката, рэжым выхаду з галадоўкі палітвязьню скасавалі. А.Казуліна, паводле Рынкевіча, перавялі на дыетхарчаваньне. У сувязі з гэтым адміністрацыя калёніі забараніла перадаваць яму прадукты ад сваякоў. Палітвязень вызвалены ад працы, а ў астатнім для яго ніякіх абмежаваньняў няма. Ён абавязаны наведваць усе ўнутраныя мерапрыемствы.

### Менчукі патрабавалі вызваліць палітвязьняў

Каля сотні чалавек узялі ўдзел у акцыі, якая прайшла 7 сакавіка ў цэнтры гораду. Яе ўдзельнікі патрабавалі скасаваньня «палітычных» артыкулаў Крымінальнага кодэксу і вызваленьня людзей, асуджаных паводле гэтых артыкулаў. Людзі сабраліся на рагу вуліц Гарадзкі Вал і Няміга і прайшлі шэсьцем да турмы на вуліцы Валадарскага.

Рукі ўдзельнікі акцыі трымалі за галавой, а на вопратцы несьлі шыльды з нумарамі артыкулаў, паводле якіх асуджаныя вядомыя беларускія палітыкі, грамадзкія дзеячы і праваабаронцы. Калі калёна дайшла да турмы, шыльды былі кінутыя ў вогнішча, адначасова ўдзельнікі акцыі разгарнулі расьцяжку «Свабоду палітвязьням!» У часе акцыі нікога не затрымалі.

### 8 сакавіка

### Непаўналетняга Антона Леванеўскага затрымалі за ўлёткі

14–гадовага **Антона Леванеўскага** затрымалі на гарадзенскім рынку «Паўднёвы» з улёткамі. Яго пратрымалі каля 2 гадзінаў у Кастрычніцкім РУУС. Пратакол міліцыянты ня сталі складаць, а ад тлумачэньняў Антон Леванеўскі адмовіўся.

### 12 сакавіка

### Па дарозе на мітынг затрымалі

беларускіх не бяруць, толькі гарэлку»).

У Алёшчы, Сітне ды навакольных хутарох за рыбнай юшкай вам абавязкова распавядуць гісторыю ў духу гэмінгўэеўскага «Старога і мора», пра Шчупака ў чалавечы рост, які ўсплываў то ў сіценскім Ізмоку, то ў Чарбамысьле, то вунь пад самым мостам цераз Палату іважыў то 10 кг, то пуд, а то і паўтара. Гэткая адвечная чалавечая мара. «Во! — паказваюць, — трымалі, падымалі, — мераюць зь сябе ростам, — во такі!!!».

Раскажуць, як цягнулі з усяе сілы, да сутаргаў, як лёска ў кроў рэзала далоні. Як ірвалася, шалёна білася гіганцкая рыбіна, як ледзь не звалакла з сабою ў ваду, як шчэрыла зубы, і хапала паветра, і зяхала, і павольна засынала на беразе.

Дзесьці агромністага шчупака секлі на кавалкі, бо не пасілелі сьцягнуць цалкам, дзесьці й гатавалі ля вады, на вогнішчы, дзесьці трыюмфальна несьлі праз усю вёску. Сага пра тое, як вяскоўцы здабывалі кожны свайго Шчупака, іх праўда вартая Гамэра. І столькі жарсьці, столькі моцы й імпэту ў тых аповедах, так загараюцца вочы, такая хватка ў рухах рук, такая сакавітая, смачная мова бруіць і віруе — што пазнаеш, пазнаеш беларуса!

Наша родная водная стыхія, у якой продкі адчувалі сябе вальней, чым на зямлі, сфармавала людзей бязьмежнае цярплівасьці, трапяткога сэрца й засяроджанага сузіраньня — нацыю на беразе ў чаканьні ўлову. Увогуле, на сур’ёзнай і нясьпешнай рыбалцы заўважаеш у роздумах ды развагах тутэйшага люду мудрасьць ды глыбіню, пільнасьць ды трапнасьць, замілаваньне й пяшчоту —усё тое, чаго не змаглі вытрусіць, вынішчыць, разбурыць у беларусе ані акупанты, ані дыктатары.

І вось тады згадваеш словы, сказаныя 2000 гадоў таму гэткім жа простым рыбаком у глухім кутку айкумэны пад чужынскім панаваньнем, нашым Госпадам Ісусам Хрыстом: «Хадземце за Мною — і Я зраблю вас лаўцамі чалавекаў» (Мацьвея 4:19).

Веру, што і старажытная Полаччына, і сама Беларусь яшчэ зьявяць сьвету сілу веры й волі, стоеныя ў рыбаку-беларусу. Што ў тутэйшага люду запаляцца вочы, вернецца спрыт, гарт ды азарт Усяслава Чарадзея, Францыска Скарыны ды Лява Сапегі — і будуць яны, як вучні Хрыста, *лаўцамі людзей*. Звычайных людзей у чалавечы рост — такіх самых беларусаў, расейцаў, украінцаў, эўрапейцаў.

І будзе гэта тады, калі, быццам паводка, падыме ўсе шматлюдныя плыні й віры ў сэрцы Эўропы беларускае нацыянальнае абуджэньне.

*в.Малое Сітна*

Сага пра тое, як вяскоўцы здабывалі кожны свайго Шчупака, і праўда вартая Гамэра.

## ХРОНІКА

### лідэраў прадпрымальнікаў

Лідэры Стачкаму прадпрымальнікаў **Валеры Леванеўскі** і **Аляксандар Васільеў** былі затрыманыя па дарозе ў Менск, дзе мусілі ўдзельнічаць у мітынгу прадпрымальнікаў. Затрымалі іх супрацоўнікі ДАІ падчас выезду з Горадні. Міліцыянты заявілі, што аўтамабіль Леванеўскага крадзены. У Гарадзенскім РУУСе іх трымалі тры гадзіны.

Мікрааўтобус застаўся ў міліцыі для праверкі, а Васільеў і Леванеўскі мусілі ўзяць таксоўку, каб вярнуцца дамоў. Валерыю Леванеўскаму не вярнулі ягоных рэчаў, якія былі ў мікрааўтобусе, у прыватнасьці, дыктафон, лічбавы фотаапарат, бэнзінавы генэратар.

### На Насту Палажанку і Аляксея Янушэўскага заведзеная крымінальная справа

Яны праходзяць у справе незарэгістраванага «Маладога фронту» (**Корбана** і **Хведарука**) у якасьці падазраваных. Ім таксама закідаюць **арт.193-1** (удзел у незарэгістраванай арганізацыі).

Палажанка зьвязвае перакваліфікацыю яе са сьведкі ў падазраваную з агульным ціскам на моладзь перад 25 Сакавіка. Дзяўчына адмовілася ад паслугаў прызначанага ёй адваката і самастойна адшукала абаронцу.

### Шахцёрам не даюць пратэставаць

Салігорскі гарвыканкам забараніў незалежнаму прафсаюзу працаўнікоў РУП «Беларуськалій» правядзеньне пікету 14 сакавіка. Фармальная нагода для забароны — эпідэмія грыпу. У найбліжэйшы час гарнякі зьбіраюцца падаваць новую заяўку.

Падчас заплянаваных на 14 сакавіка акцый удзельнікі меркавалі ўзьняць пытаньні падвышэньня каэфіцыенту аплаты працы працаўнікам абагачальных фабрыкаў, а таксама вырашэньня жыльлёвых праблемаў працаўнікоў прадпрыемства.

У Салігорску працягвае працу спэцыяльная камісія, якая высьвятляе прычыну гібелі шахтара **Мікалая Кісяля**, што загінуў 19 лютага ў выніку абвалу ў шахце. У складзе камісіі працуюць прадстаўнікі прафсаюзу і адміністрацыі прадпрыемства, супрацоўнікі праваахоўных органаў і МНС.

### Амбасадарка ЗША ды Зьміцер Бартосік у гасьцях у Міколы Статкевіча

Палітвязьня **Міколу Статкевіча**, які адбывае пакараньне на «хіміі» ў вёсцы Блонь Пухавіцкага раёну за арганізацыю дэманстрацыяў пратэсту супраць фальсыфікацыі вынікаў выбараў і рэфэрэндуму 2004 г., наведала амбасадарка ЗША **Карэн Ст’юарт**. Гэта першы візыт кіраўніка амэрыканскай амбасады да Міколы Статкевіча. Раней некалькі разоў яго наведвалі амбасадары Нямеччыны, Швэцыі, Чэхіі, Славакіі, а таксама кіраўнік місіі АБСЭ Оке Пэтэрсан. Размова сп.Статкевіча з амбасадаркай працягвалася каля дзьвюх гадзінаў.

Раней, 7 сакавіка, палітвязьня наведаў бард **Зьміцер Бартосік**, які зладзіў для Міколы Статкевіча і насельнікаў інтэрнату імправізаваны канцэрт.

### Гарадзенскія памежнікі ізноў цікавяцца «каліноўцамі»

На чыгуначным вакзале ў Горадні памежнікі перапісалі дадзеныя студэнтаў, што навучаюцца ў Польшчы на **праграме імя Кастуся Каліноўскага**. Гэта адбылося перад адпраўленьнем польскай электрычкі. Памежнікі перапісалі дадзеныя са студэнцкага білету **Яўгена Скрабутана**. Затым забралі ягоныя квіток і пашпарт, але па нейкім часе дакумэнты хлопцу вярнулі. Гарадзенскія памежнікі таксама зацікавіліся студэнцкімі пасьведчаньнямі яшчэ двух «каліноўцаў», якія праходзілі кантроль раней за Скрабутана.

### 13 сакавіка

###Ператрус у Гарэцкага

Поўна ўвечары сьледчая група правялаператрусы на кватэрах прэс-сакратара незарэгістраванага “Маладога фронту” **Барыса Гарэцкага і ягонай маці**. Сканфіскаваныя паперы і сыстэмны блёк братавага кампутара.

### Допыты ў Горадні

Супрацоўнікі гарадзенскага КДБ наведалі навучальныя ўстановы. Зь непаўналетнімі **Вольгай Смалянчук**, **Яўгеніяй Шасьцераковай** ды **Вольгай Галубец** яны размаўлялі ў школах. З **Хрысьцінай Марчук** і дзяўчынай, чыё імя не паведамляецца, — у дэканаце філфаку ўнівэрсытэту. Дзяўчатам паведамілі, што іх імёны былі ў сканфіскаваным падчасператрус на кватэры Насты Палажанкі сьпісе.

# Каталікі пратэстуюць супраць перабудовы кляштару ў гатэль

Ад мінулага чацьвярга ў менскіх касьцёлах вядзецца збор подпісаў супраць плянаванай рэканструцыі кляштару бэрнардынаў пад гатэль з забаўляльным цэнтрам. Гэтую акцыю благаславіў біскуп Менска-Магілёўскай архідыяцэзіі Антоні Дзям'янка.

У звароце вернікаў на імя Лукашэнкі, у прыватнасьці, гаворыцца: «…мы абураныя бязбожным плянам рэканструкцыі манастырскага комплекса і храма сьв. Язэпа… Мы пратэстуем супраць перабудовы асьвечанага храма і манастыра — месца малітвы і духоўнага адраджэньня нашага народу — пад гатэльны комплекс, развесяляльныя залі, рэстараны…». Вернікі папрасілі вярнуць кляштар бэрнардынаў Менска-Магілёўскай Архіяпархіі і зазначылі, што ў храме сьв. Язэпа будуць праводзіцца набажэнствы на беларускай мове, а манастырскія памяшканьні будуць выкарыстоўвацца пад Нядзельную школу і Епархіяльныя ведамствы. Подпісы пад гэтым адкрытым лістом зьбіраюцца пасьля імшы ў менскіх касьцёлах. Подпісаў сабрана багата, збор не спыняецца.

Нагадаем, грэка-каталіцкая парафія Сьвятога Язэпа была зарэгістраваная пры былым бэрнардынскім касьцёле ў 1990, рыма-каталіцкая — 7 жніўня 2001.

Штовечар перад старадаўнімі мурамі адбываюцца набажэнствы вернікаў аб вяртаньні ім сваёй сьвятыні.

**СХ**

# Таямнічае шэсьце ў падтрымку палітзьняволеных у цэнтры Менску



Сотня чалавек узяла ўдзел у бліц-акцыі 7 сакавіка. Яны трымалі рукі за галавой, а на вопратцы мелі шыльды з нумарамі артыкулаў, паводле якіх асуджаныя вядомыя беларускія дзеячы. Шэсьце пачалося на рагу вуліцаў Гарадзкі Вал і Няміга і скончылася каля турмы на Валадарцы. Там удзельнікі шэсьця пакідалі шыльды ў вогнішча і разгарнулі расьцяжку «Свабоду палітвязьням!».

У мерапрыемстве брала ўдзел пераважна моладзь. Усё выглядала арганізавана, хоць ніводная з моладзевых арганізацыяў не заявіла пра непасрэдны ўдзел у падрыхтоўцы акцыі.

**Сямён Печанко, паводле Джынс.by**

## ХРОНІКА

### …у Магілёве

На допыты ў мясцовы КДБ выклікалі сем чалавек. Сьледчых **Грыбайлу**, **Ішчынку** ды **Курпачэнку** цікавіла тое ж, што і іх гарадзенскіх калегаў: абласныя ды сталічныя структуры «МФ», хто кіруе арганізацыямі, якое дачыненьне да арганізацыі мае дапытаны. **Антона Усьцімчука**, **Тацяну Буланаву**, **Максіма Азарава** і непаўналетняга **Расьціслава Панкратава** дапытвалі ў якасьці сьведак па справе «дзейнасьці ад імя незарэгістраванай арганізацыі». З магілёўскай спэцкамэндатуры ў абласны КДБ выклікалі на допыт **Артура Фінькевіча**, які адбывае пакараньне за палітычнае графіці. Днём раней быў дапытаны **Кірыла Паражынскі**. **Крысьціна Шацікава** чакае выкліку на допыт.

### Допыт мастоўскага дэпутата

У Мастах у якасьці сьведкі дапыталі дэпутата мясцовага раённага савету **Зьмітра Кухлея**. Дзеля гэтага з Ваўкавыску адмыслова прыехаў маёр КДБ **Васіль Барысік**, якога цікавілі пытаньні, датычныя **Корбана** і **Хведарука**, ды агульная інфармацыя пра дзейнасьць арганізацыі.

### У Жлобіне

Мясцовыя КДБісты і дапыталі былога маладафронтаўца **Эдуарда Зелянкова**. Допытам кіраваў гомельскі супрацоўнік КДБ, які спасылаўся на загад са сталіцы. Былі дапытаныя і некалькі актывістаў арганізацыі, у т.л. непаўналетні **Кірыл Атаманчык**, які на допыт зьявіўся разам з бацькам.

### 14 сакавіка

### Яшчэ адна крымінальная справа

Знаходзячыся на допыце ў гарадзкой пракуратуры прэс-сакратар незарэгістраванага «Маладога фронту» **Барыс Гарэцкі** даведаўся ад сьледчага **Сяргея Грахоўскага**, што стаўся падазраваным у справе «Маладога фронту». У сувязі з гэтай крымінальнай справай, сьледчы дапытаў таксама **Зьмітра Хведарука**, **Людмілу Атаколаву**, **Віктара Янчарэвіча**

### Віцебскія гутаркі

У Віцебскую абласную ўправу КДБ выклікалі на гутарку студэнта **Андрэя Данілеўскага.** Задалі ўсяго два пытаньні: што яму вядома пра «Малады фронт» і ці мае ён дачыненьне да яго дзейнасьці.

У ў навучэнкі віцебскага ліцэю №1 **Алены Багданавый** супрацоўнікі КДБ пыталіся пра тое, колькі плацяць сяброўскіх унёскаў у «Маладым фронце», ці ведае яна лідэраў або шарагоўцаў арганізацыі, чаму ейныя тэлефоны зафіксаваныя як кантакты зь віцебскімі «маладафронтаўцамі».

У Віцебску дапыталі і адзінаццацікласьніка віцебскай гімназіі №1 **Ўладзіслава,** студэнтку **Юлію Матусевіч**, а ў аршанскім гараддзеле КДБ гутарылі з актывістам **Ігарам Казьмярчаком**.

**СП**

# Станіслаў Шушкевіч: «Думаю, што на Дзень Волі выйдзе шмат людзей»

Былы кіраўнік Беларусі **Станіслаў Шушкевіч** у гутарцы з карэспандэнтам «Нашай Нівы» падзяліўся сваім бачаньнем бягучых палітычных падзей і рашуча падтрымаў Мілінкевіча.

**«Наша Ніва»: Чаму да гэтага часу Вы не занялі актыўную пазыцыю адносна правядзеньня Кангрэсу дэмакратычных сілаў?**

**Станіслаў Шушкевіч:** Я займаю вельмі актыўную пазыцыю па гэтым пытаньні, як і па многіх іншых, але не праз СМІ. Да сёньняшняга часу я імкнуўся пазьбягаць крытыкі аб’яднанай апазыцыі, бо лічу непрыстойным нападаць на тых, хто змагаецца зь цемрашальствам улады. Цяпер жа настаў той момант, калі маё цярпеньне скончылася, бо дзеяньні пэўных асобаў у апазыцыі я не магу трактаваць інакш як контрападуктыўныя ў адносінах да ідэалаў, за якія мы змагаемся.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**«НН»: Што зьмянілася ў аб’яднанай апазыцыі ад часу першага Кангрэсу?**

**СШ:** Мінулы Кангрэс быў сапраўды дэмакратычным, бо ў ім удзельнічалі тыя, хто перамаглі на рэгіянальных выбарчых сходах. Улада проста шалела, перашкаджаючы правядзеньню такіх сходаў. Але дэлегаты ўсё адно былі абраныя, і яны атрымалі права прадстаўляць дэмакратычныя сілы. Той Кангрэс меў цалкам празрыстую структуру, таму туды не маглі патрапіць «свае» людзі. Цяпер жа ніякага абраньня дэпутатаў няма. Працы зь людзьмі па правядзеньні Кангрэсу так мала, што няма аб чым гаварыць. Мы пачалі ўводзіць самі сябе ў зман, калі абіраем дэлегатаў Кангрэсу шляхам збору подпісаў. Мне сорамна за некаторых палітыкаў, якія хочуць бачыць на Кангрэсе як мага больш «сваіх» людзей. І мне зразумелы крык душы Аляксандра Мілінкевіча. Гэта актуальна, бо мы страчваем сваю маральнасьць, калі пачынаем дзейнічаць мэтадамі уладнай вэртыкалі. Замест рэальнай падрыхтоўкі да Кангрэсу мы бачым поўную палітычную інфантыльнасьць.

**«НН»: Вы падтрымліваеце ідэю ратацыі лідэраў апазыцыі?**

**СШ:** Мне здаецца, што многія ў стане апазыцыі не чакалі такога хуткага росту рэйтынга Аляксандра Мілінкевіча. Гэта і стала для многіх непрымальным. Яны забыліся, што менавіта да гэтага мы ўвесь час і імкнуліся, што папулярнасьць лідэра ніяк не перашкаджае рэалізацыі праграм палітычных партый, грамадзкіх аб’яднаньняў. Нягледзячы ні на што, Мілінкевіч і сёньня мае падтрымку большасьці сяброў Палітрады. Мілінкевіч умее слухаць і рабіць з гэтага высновы, ён ніколі ня здраджвае сваім прынцыпам. Яго пазыцыі не атрымліваецца пахіснуць, як бы гэта ні спрабавалі зрабіць некаторыя суб’екты, якія да гэтага часу не падпісалі дакумэнтаў аб’яднаных дэмакратычных сілаў, але запрашаюцца на Палітраду. Я лічу Мілінкевіча лідэрам апазыцыі і ня бачу падставаў для яго зьмены.

**«НН»: На ваш погляд, ці дастаткова актыўна праходзіць падрыхтоўка да сьвяткаваньня Дня Волі?**

**СШ:** Мне здаецца, што досыць актыўна. Найперш, гэта заслуга Аляксандра Мілінкевіча і Партыі БНФ, яны надалі сьвяту добрую афарбоўку. Лічу вельмі ўдалым крокам накіраваньне шматлікіх лістоў з запрашэньнем на 25 Сакавіка ў замежжа. Мілінкевіч растлумачыў людзям, што ён зьвярнуўся да ўладаў, каб яны дазволілі гэтае сьвята. Ён зьвярнуўся і да Лукашэнкі, хаця я ня вельмі ўхваляю гэты крок. Але, калі раптам пачнуцца затрыманьні, і людзі запытаюцца, чаму мы не зьвярнуліся да ўлады, то будзе канкрэтны адказ. Аднак дастукацца да Лукашэнкі ў гэтай сытуацыі проста нерэальна. Цяжка пакуль сказаць, як будзе рэагаваць улада. Думаю, што яна не дазволіць правядзеньня Дня Волі ў прыстойным месцы, калі дазволіць увогуле. Трэба берагчы сябе ад розных правакацыяў.

Калі нехта захоча прыйсьці на плошчу з чырвона-зялёным сьцягам, то ня трэба гэтых людзей адкідваць. Думаю, што ўдзел у акцыі могуць прыняць многія. Раскажу вам прыклад з уласнай сям’і. У мяне шмат пляменьнікаў, унучатых пляменьнікаў, дык яны ўсе зьбіраюцца ісьці на гэтую акцыю. Спадзяюся, што надвор’е будзе спрыяць людзям, таму, думаю, што акцыя будзе масавай.

**Гутарыў Зьміцер Панкавец**

# Апалёгія Інтэрнэту, альбо Антыапалёгія Інтэрнэту — 2

Гісторыя нараджэньня прыгаворкі «превед, медвед!» і яшчэ пра мядзьведзяў, публіцыстыку і палітыку. Піша **Віталь Тарас**.

У адным палемічным артыкуле, які давялося нядаўна прачытаць у Сеціве, кінулася ў вочы пачатковая фраза. Зьвяртаючыся да свайго апанэнта, аўтар — здаецца, прафэсар філялёгіі — выказвае надзею і адначасова як бы пажаданьне: «Спадзяюся, калега, Вы не чытаеце камэнтароў у Інтэрнэце».

Адразу ўспомніліся словы булгакаўскага героя прафэсара Праабражэнскага, які раіў свайму асыстэнту не чытаць да сьнеданьня савецкіх газэтаў. На заўвагу асыстэнта, што іншых няма, прафэсар адказаў: «Вось ніякіх і не чытайце».

Зразумела, ня можа быць ніякага параўнаньня паміж савецкімі газэтамі 20-х гадоў і глябальным Сеціваम. Тых, хто чытаў некалі артыкул у «Нашай Ніве» «Антыапалёгія Інтэрнэту», аўтар хоча адразу супакоіць — ён не зьбіраецца ваяваць зь ветракамі ці пляваць супраць ветру, то бок прагрэсу. Гэта сапраўды сьмешна. А калі аўтарская іронія, а галоўнае — самаіронія засталіся, як гогалеўскія сьлязы, незаўважаныя чытачом, тым горш для аўтара.

Ёсьць час раскідваць камяні і ёсьць час іх зьбіраць. Прыйшоў час выправіць памылку і пакаяцца. Прыкладна так, як гэта зрабіў экс-шпіён і здраднік сацыялістычнай радзімы Віктар Сувораў, які назваў свой раман пра маршала Жукава «Бяру свае словы назад». Але перш чым перайсьці непасрэдна да тэмы Інтэрнэту ды іншых, больш-менш сур'ёзных рэчаў, яшчэ некалькі словаў наконт газэт і камэнтароў.

## «Кузькіна мать» і глямур

Варта зазначыць, што гэты жанр публіцыстыкі нарадзіўся задоўга да нараджэньня Інтэрнэту. Мабыць, яшчэ ў эпоху, калі ўсе газэты былі савецкімі. Найбольш распаўсюджанай формай камэнтару за савецкім часам быў выраз кшталту «а яшчэ капялюш насунуў!» Дарэчы, тон задаў некалі Ўладзімер Ленін, які ў сваіх філязофскіх (!) спытках рабіў заўвагі да Гегеля ці іншых філёзафаў накшталт «га-га-га!», «бязглузьдзіца!» і да т.п. (NB! Хіба гэта не нагадвае некаторыя сучасныя заўвагі ў ЖЖ — «гыгы», «ужоснах» і іншыя?).

Трэба прызнацца ў тым, што аўтар гэтых радкоў у былую эпоху ня толькі сам набыў шкодную звычку чытаць газэты да сьняданка, але працаваў у некаторых савецкіх выданьнях. («ЛіМ», які нядаўна адзначыў сваё 75-годзьдзе і ў якім аўтару пашчасьціла працаваць пры галоўным рэдактару Анатолю Вярцінскім і ягоным намесьніку Міколу Гілевічу, у лік сапраўды савецкіх, усё ж, не ўваходзіць). Дык вось, самай цяжкай і брыдкай справай у газэце была праца зь лістамі чытачоў. Нездарма гэтую няўдзячную справу ў рэдакцыі часьцяком звальвалі на салагаў — то бок журналістаў-пачаткоўцаў альбо ўвогуле пазаштатных супрацоўнікаў, каб назаўсёды адвадзіць іх ад журналісцкай працы.

Мала таго, што на кожны ліст ( у тым ліку ад пацыентаў псыхдыспансэраў) трэба было адказаць цягам двух тыдняў, дык яшчэ лісты, якія хоць чымсьці адпавядалі курсу партыі і ўраду, трэба было літаратурна апрацаваць і апублікаваць на відным месцы. Вось толькі з ананімкамі не заўсёды ведалі, што рабіць. Адказваць не адказвалі, але, калі ў ананімцы быў сыгнал пра «ворагаў» ці пра амаральныя паводзіны шэраговага члена партыі, рэагавалі абавязкова — з адпаведнымі арганізацыйнымі высновамі.

Шмат што зьмянілася з таго часу. Цяперашнія штодзённыя афіцыйныя газэты ня станеш праглядаць ані раніцай, ані ўвечары — у іх няма чаго чытаць. Калі савецкі афіцыёз было цікава вывучаць хаця б крэмлязнаўцам, якія вывучалі па фатаграфіях, у якім парадку стаяць члены палітбюро на трыбуне маўзалею, дык цяпер і такой інфармацыі шукаць няма сэнсу. Адбылася дэвальвацыя зьместу, аднак многія савецкія звычкі засталіся.

## «Страна советов»

Нездарма назву «Краіна Саветаў» многія разумелі па-расейску літаральна — як краіну «советов». Прычым, абсалютна бясплатных. Паважаны беларускі палітык, якому аўтар гэтых радкоў ад усяе душы зыча посьпеху, неяк пры сустрэчы выказаў пажаданьне, каб у матэрыялах аднаго незалежнага выданьня ўтрымлівалася больш аптымізму. Як потым высьветлілася, ён сам тае газэты не чытаў, але ў адсутнасьці ў ёй неабходнага для перамогі справы дэмакратыі пафасу не сумняваўся апрыёры. Бо калі газэта не пытаецца ў партыі, або кагосьці яшчэ, штó канкрэтна яна павінна несьці ў масы і зь якім зарадам — станоўчым або адмоўным, дык гэтая газэта выглядае неяк падазрона і несалідна. Палітычнай карысьці ад яе ніякай.

Але й новае пакаленьне чытачоў, якое аддае перавагу ня кнігам і ўжо тым больш — не газэтам, не пазбаўленае родавых прыкметаў мінулае эпохі. У сваіх камэнтарах у Інтэрнэце да публікацыяў розных аўтараў ім раяць праяўляць больш альбо менш аптымізму, дакараюць адсутнасьцю іроніі, альбо катэгарычна патрабуюць быць меней іранічным, меней пісаць аб Расеі і больш — аб Беларусі, меней цытаваць расейскую ды іншую клясыку і болей называць канкрэтных імёнаў, альбо не называць ідэалягічна чужых прозьвішчаў увогуле, каб не ствараць ім піяр, быць больш эмацыйным і меней рэфлексаваць, быць болей прагрэсіўным і меней лібэральным, быць больш стрыманым у ацэнках і не «размазваць соплі»…

Сёньня ня тое што публіцыстыка ленінскай школы, але публіцыстыка як жанр адыходзіць у нябыт. І ў гэтым — праява непераможнай моцы й перавагі Інтэрнэту, якому аўтар спрабуе

прасьпяваць запозьнены панэгірык.

## «Surprize» ад Джона Луры

У глябальным Сеціве, як і ў жыцьці, ёсьць месца для ўсяго — для высокай паэзіі і парнаграфіі, арыгінальных ідэяў і графаманіі, для зарабленьня шалёных грошай і марнай іх траты. Хтосьці можа разглядаць Інтэрнэт як дошку для абвестак і дацзыбао, а хтосьці – як грандыёзны праект пераўтварэньня сьвету. Пра Сеціва можна сказаць амаль гэтак сама, як Чэрчыль некалі казаў пра дэмакратыю. Інтэрнэт ёсьць найгоршай формай камунікацыі людзей за выключэньнем усіх астатніх.

Інтэрнэт стаў ня проста сродкам дасягненьня свабоды слова, ён ёсьць увасабленьнем гэтай свабоды. Палата прадстаўнікоў, даўно занепакоеная «разгулам анархіі» ў беларускім Інэце, зьбіраецца прыняць закон аб інфармацыі і інфарматыцы, які дазволіў бы распаўсюдзіць цэнзуру і абмежаваньні свабоды прэсы на глябальнае Сеціва. Само слова «інфарматыка» прымушае ўспомніць дапатопныя часы, калі ў школах дзяцей спрабавалі навучаць ня навыкам працы з кампутарам, але сухой і малацікавай тэорыі. Сёньня дзеці самі могуць навучыць сваіх настаўнікаў- «чайнікаў» такім практычным ведам, якія тым і ня сьніліся. Спрабаваць забараніць Інтэрнэт у наш час — гэта амаль тое ж, што забараніць людзям дыхаць.

Што тычыцца «выдаткаў» свабоды слова, дык дзеля гэтага прыдуманыя, між іншым, блогі. Гэта свайго роду клюбы паводле інтарэсаў. Калі камусьці не падабаецца лексыка альбо зьмест дыскусіі — можаш пакінуць яго ў любы момант, альбо, увогуле, не паведамляць пра сваю прысутнасьць.

Блогі апошнім часам пішуць усе. Напрыклад, міністар замежных справаў Швэцыі Карл Більт завёў блог, у якім у вольны ад працы час стаў апісваць свае прыватныя ўражаньні ад сустрэч з рознымі афіцыйнымі асобамі. Гэта чамусьці вельмі ўсхвалявала расейскіх журналістаў, якія на адным з тэлеканалаў доўга дыскутавалі — а ці не парушае тым самым замежны дыплямат правілы сваёй карпарацыі і, увогуле, правілы прыстойнага тону. Ім не прыйшло да галавы, што гэта асабістая справа грамадзяніна па прозьвішчы Більт. Зразумела, уявіць сабе ў такой ролі, скажам, міністра замежных справаў Расеі Лаўрова было б цяжка.

Яшчэ цяжэй уявіць сабе аўтарамі блогаў беларускіх чыноўнікаў. Адсутнасьць уласнага меркаваньня, безумоўнае падпарадкаваньне начальству і інстынктыўная нелюбоў да ўсіх праяваў свабоды ніяк не стасуецца з прынцыпамі Інтэрнэту. Хаця, ня выключана, пройдзе некалькі гадоў, і на зьмену цяперашняму начальству прыйдзе новае пакаленьне ўпраўленцаў, узгадаванае, сярод іншага, на гульні ў Doom, блогах і ЖЖ. Праўда, гэта зусім не азначае, што яны будуць кіравацца ў сваёй дзейнасьці высокімі прынцыпамі маралі, а ня вузкімі карысьлівымі інтарэсамі.

На завяршэньне — інтэрнэт-гісторыя, якая прывяла аўтара гэтых радкоў у захапленьне. У ёй, нібы ў кроплі вады, адлюстравалася, як падаецца, сама сутнасьць спэцыфічнай, шматграннай, постмадэрніцкай зьявы пад назваю Інтэрнэт. Ва ўжо згаданым артыкуле «Антыапалёгія Інтэрнэту» аўтар з клінічнай радасьцю нэафіта прыводзіў прыклады так званай падонкаўскай мовы ў расейскім сеціве — у прыватнасьці, папулярныя словы «превед, медвед!» Сама гісторыя зьяўленьня выразу куды цікавейшая за канстатацыю таго факту, што падонкаўскай мовай нярэдка карыстаюцца і ў беларускім Сеціве.

14 сьнежня 1952 году ў Мінэапалісе, штат Мінэсота, нарадзіўся джазмэн-авангардыст Джон Луры. У юнацтве ён граў на саксафоне і ў 1978 годзе разам са сваім братам Эванам стварыў у Нью-Ёрку гурт Lounge Lizards. Пазьней Луры пачаў пісаць музыку да фільмаў авангарднага кінарэжысэра Джыма Джармуша і здымацца ў ягоных фільмах. (Айчыннаму гледачу найбольш вядомы фільм Джармуша «Мярцьвяк»). У 2000 годзе Джон Луры выпусьціў музычны альбом пад псэўданімам Марвін Пантыяк. На афіцыйным сайце ягоная біяграфія пачынаецца са словаў : «У ліпені 1977 году Марвін Пантыяк быў зьбіты на сьмерць аўтобусам, які паставіў кропку ў жыцьці аднаго з найбольш загадкавых геніяў сучаснае музыкі». Далей распавядаецца пра нялёгкае жыцьцё Марвіна, які правёў апошнія гады ў псыхіятрычнай лякарні ў Дэтройце.

Некалькі гадоў таму рэальная хвароба прымусіла Джона Луры зьмяніць саксафон на пэндзаль. Ён стварае мініятуры, зробленыя каляровай крэйдай, акварэльлю і гуашшу. І сярод гэтых работ, зробленых у прымітывісцкім стылі, ёсьць малюнак з парачкай, якая займаецца сэксам, і грозным мядзьведзем, які не вядома скуль узяўся.

Празь некаторы час гэты малюнак зьявіўся на расейскім сайце dirty.ru. Яго зьмясьціў там нехта Lobzz. Як удалося высьветліць інтэрнэт-часопісу «Я», пад гэтым нікам хаваўся 28-гадовы Раман Яцэнка з Украіны, які жыве цяпер у Данецку і займаецца авіяперавозкай грузаў. Паводле ягоных словаў, здарылася гэта 3 лютага 2006 году. Яцэнка задумаў пост пра дзікіх зьвяроў, якіх маглі сустрэць у лесе наведнікі папулярнага расейскамоўнага сайту. Лепшай ілюстрацыі, чымся малюнак Луры, проста нельга было прыдумаць. Адно, што слова «surprize», якое ў арыгінале вымаўляе мядзьведзь, падалося аўтару пасту невыразным, і ён замяніў яго на «превед!» Аўтарам гэтага папулярнага слова лічыцца вядомы ў сваіх колах дзеяч контракультуры, стваральнік L-text Дзьмітры Бялінскі.

Малюнак зь «медведам» (як яго хутка пачалі называць) перадрукавалі на нейкім іншым сайце, пасьля чаго ён пачаў сваё пераможнае шэсьце ў расейскамоўным сэктары Livejournal.

Сёньня на слова «превед» пошукавая сыстэма Google выдае больш за 1 мільён 330 тысяч спасылак. У Інтэрнэце зьявіўся новы смайлік «Y», які стылізуе медзьведзя з раскінутымі лапамі.

Зьявілася ўжо і шмат культуралягічных дасьледаваньняў пра фэномэн «медведа». Адзін з аўтараў, напрыклад, называе яго расейскім варыянтам «левіяфана» — пачвары, якая выступае сымбалем дзяржавы, вялікай і жахлівай. Бо ў малюнку адлюстраваная сытуацыя максымальнага ўварваньня дзяржавы ў прыватнае жыцьцё. Але слова «превед» зьніжае сытуацыю й робіць яе гранічна сьмешнай.

Нездарма «медвед» зьявіўся і ў беларускім Інэце падчас мінулагодніх сакавіцкіх падзеяў. Малюнак на «Беларускай жабе» ня толькі ў іранічнай форме адлюстроўваў тэму процістаяньня, але шмат у чым адпавядаў унутранаму сьветаадчуваньню свабодных людзей, пазбаўленых стэрэатыпаў і ілжывага пафасу старэйшых таварышаў і настаўнікаў.

Чамусьці падумалася — а чаму б аўтарам беларускіх блогаў і пастоў у ЖЖ не знайсьці беларускі адпаведнік расейскага «превед» і ангельскага «surprize»?




МАЛЯВАЎ ЛЯВОН ВОЛЬСКІ

# Вялікі дзякуй за ахвяраваньні

**Яўгену К., Андрэю М., Станіславу Б., Р.Н., Уладзімеру Г., Н.Б., Тацяне Р., Івану Н., С.Я., Ігару Д., Л.Ф., А.Б., Алене М., А.Ж., Людміле Ц., А.Л., Надзеі М., Уладзімеру К., Ганьне Дз., Ігару Б., Сьвятлане Б.** зь Менску.

**Мікалаю Ж.** з Мазыра.

**Яўгену Ф.** з Бабруйску.

**Тамары Ш., Сержуку Р.** зь Бярозаўскага раёну.

**Іне С.** з Барысава.

**Аляксандру К.** зь Берасьця.

**Мікалаю К.** з Лунінецкага раёну.

**Мікалаю Х.** са Шчучынскага раёну.

**Уладзімеру Т.** са Жлобінскага раёну.

**Антону Т.** з Жодзіна.

**Н.П.** з Ваўкавыскага раёну.

**Інэсе В.** з Барані.

**Уладзімеру П.** з Аршанскага раёну.

**Аляксандру У.** з Гомелю.

**Лілії Я., Андрэю А., Сьцяпану Г.** зь Менскага раёну.

**А.В.** зь Мядзельскага раёну.

**Івану Ц.** з Зэльвенскага раёну.

**Сяргею К.** з Салігорску.

**Сяргею Р., Дз. І.** з Горадні.

**Пётру Б.** зь Берасьцейскага раёну.

**Г.Я.** са Сьветлагорску.

**М.С.** са Слуцку.

**Ю.Ц.** з Баранавічаў.

**Сяргею С.** з Полацку.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521

МГД ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3015 212 000 012** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

КВІТАНЦЫЯ

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521

МГД ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3015 212 000 012** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газэту, дасылайце адрасы і прыватныя ахвяраваньні.**

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84; e-mail: dastauka@tut.by; паштовы адрас: а/с 537, 220050, Менск.

2) Просім кожную сям’ю чытачоў **пералічваць на рахунак** газэты ахвяраваньне з разьліку 8000 рублёў на месяц. Гэтага хопіць на выхад і дастаўку газэты. **У блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага перakазу дакладна і разборліва пазначайце адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад’езду.** Тыя, хто перакажа 24000 рублёў за раз, забясьпечаць выхад «НН» на 3 месяцы. Хто перакажа 48000 рублёў адразу, гарантуе публікацыю «НН» на паўгоду.

## Капусьцінскі вярнуўся ў Пінск

**У Пінску, у актавай залі гарадзкой бібліятэкі адбылося мерапрыемства, прысьвечанае 75-м угодкам славутага польскага журналіста і пісьменьніка Рышарда Капусьцінскага.** На жаль, сам Р. Капусьцінскі не дажыў да свайго юбілею, ён памёр у студзені сёлета ў Варшаве.

Вось жа, група палякаў, аматараў і дасьледчыкаў ягонай творчасьці, каб ушанаваць памяць «караля рэпартажу», вырашыла адзначыць гэты юбілей менавіта ў Пінску, у родным горадзе журналіста. Пінчукам быў прадстаўлены спэктакль у выкананьні адной акторкі паводле кнігі Р. Капусьцінскага «Імпэратар». Дарэчы, гэта адзіны твор публіцыста, які можна прачытаць па-беларуску. Але ёсьць спадзеў, што не апошні, бо ўжо перакладаюцца на нашу мову такія кнігі, як «Падарожжа з Герадотам» і «Імпэрыя». Гэта дапаможа і беларусам адкрыць для сябе творчасьць нашага земляка. Бо як ні крыўдна, але нават у Пінску мала хто ведае пра гэтую асобу. І гэта нягледзячы на тое, што ён быў адным з найбольш перакладаных на замежныя мовы польскіх аўтараў сучаснасьці.

Але прыйдзе час і Рышард Капусьцінскі вернецца на сваю малую радзіму, а можа, мы проста не заўважылі, што ён ужо вярнуўся, бо ў сваёй кнізе «Імпэрыя» ён сам напісаў пра гэта: «Апоўдні я пайшоў у касьцёл. Пасьля імшы, калі выходзілі людзі, падышоў і спытаў, ці хто помніць маіх бацькоў, якія навучалі тут, у школе. І сказаў, як мяне завуць. Аказалася, што тыя, хто выходзіў з імшы, былі вучнямі маіх мамы і таты.

Я вярнуўся ў дом свайго дзяцінства».

**Яўген Саляйчук, Пінск**

## Пра мову...

**«Асьцярожна, дзьверы зачыняюцца. Наступная станцыя...» — гэта мы чуем кожны раз, заходзячы ў гарадзкі транспарт.** Для кагосьці гэта і ёсьць адзіная крыніца вывучэньня роднае мовы, адзінае месца, дзе можна яе пачуць — аўтобус або мэтрапалітэн. Дзіўна. Але ўсе лічаць сябе беларусамі...

Аднойчы на канцэрце да мяне падышла дзяўчына і спытала: «А вы ня ведаеце, дзе тут прыбіральня?». Я ў адказ зрабіла такі спалоханы твар (як жа гэта, у мяне спыталі штосьці па-беларуску?), што бедная дзяўчына яшчэ да таго, як я зразумела, што ад мяне хацелі, сказала: «Выбачайце», — і пайшла далей шукаць тую самую прыбіральню. Сорамна? Канечне. Ня ведаць, што значыць «прыбіральня», — якая ж я беларуска? Сорамна...

І сорамна будзе яшчэ шмат часу, пакуль не пачнецца зноў беларускае адраджэньне. Я лічу, перш-наперш, яно павінна ісьці зьверху, але я цяпер не пра гэта.

На ўроках беларускай мовы, літаратуры колькі разоў гучалі словы: «Шануйце, любіце, паважайце родную мову!», «Роднае слова — гэта наш гонар, наша краса, наш скарб!», «Беларуская мова — другая па мілагучнасьці ў сьвеце!» і гэтак далей, але як толькі мы чулі званок, мы хутка забываліся на гэтыя прыгожыя, мілыя сэрцу словы. Яны чамусьці хаваліся ў самы патаемны куточак кары галаўнога мозгу і ўсплывалі зноў толькі на наступных уроках. Сорамна? Канечне.

А затое моладзь, якая размаўляе па-беларуску сёньня, чамусьці заўсёды апазыцыйна настроеная, нягледзячы на тое, што мова зусім не паказвае палітычнае арыентацыі.

Затое 75% беларускай музыкі на радыёстанцыях не ўключаюць ніводнае песьні на беларускай мове... Сорамна?

Аднойчы на 25 Сакавіка, нашае сапраўднае неафіцыйнае сьвята, я паспрабавала цэлы дзень размаўляць па-беларуску: праз паўдні я здалася. А гэта выявілася сапраўды цяжкім. У школе нас вучылі высокім словам, такім, як самаадданасьць, пачуцьцё ўласнай годнасьці і інш., а ў жыцьці мы ня ведаем, як будзе «фэн» па-беларуску. Чаму ж так?

Дык які ў нас білінгвізм, калі на роднай мове мы і дня размаўляць ня можам, і не таму што нешта нязручна, а таму што на побытавым узроўні мы гэтага зрабіць фізычна ня можам. Сорамна? Мне — не, я хоць бы спрабавала. А вам?

**Студэнтка Дар'я Бонда**

## Абкрадзенае пакаленьне

*Прыглядзьцеся, якая хліпенькая ў беларусаў нацыянальная самасьвядомасьць! Такое здэбеларусаванае інтэлігенцыі, асабліва ў яе верхніх зрэзах, у нашай краіне яшчэ ніколі не было...*

***Леанід Лыч, прафэсар***

**Знайсьці бібліятэку ў шпіталі для інвалідаў і вэтэранаў Вялікай Айчыннай вайны ў Бараўлянах ня так проста для таго, хто ўпершыню трапіў туды.** Яна месьціцца ў сутарэнным, ня надта раскошным памяшканьні пад сталоўкай на 540 пасадачных месцаў — такой, бадай, ня знойдзеш болей ні ў адным шпіталі. Па прыбыцьці сюды я пацікавіўся ў суседзяў па палаце, дзе месьціцца тут бібліятэка. Яны ў адказ пацепвалі плячыма і адказвалі, што яна іх не цікавіць, хапае і тэлевізару. Але, як той казаў, язык да Кіева давядзе. Маладзенькая мэдсястра на посьце ў лекавым аддзяленьні растлумачыла, як знайсьці тую бібліятэку, і я хутка патрапіў туды, спусьціўшыся па вінтавой лесьвіцы ў сутарэньне. На сьцяне зьлева ў чытальнай залі ўбачыў партрэты ў рамках Янкі Купалы і Максіма Горкага, а паміж імі — крыху большы партрэт Пятра Машэрава, які, як стала вядома, быў ініцыятарам пабудовы гэтай лячэбніцы для інвалідаў і вэтэранаў вайны. На сталах у зале ляжалі падшыўкі дзяржаўных расейскамоўных газэт, у іх ліку і «Коммунист Белоруссии». Зь літаратурных часопісаў ня ўбачыў нават даўно знаёмых «Полымя», «Маладосьці», «Нёману», толькі часопіс «Беларуская думка», які сваім зьместам вельмі нагадвае колішні «Коммунист Белоруссии» савецкай эпохі.

Бібліятэкарка, былая настаўніца, пэнсіянэрка, даволі ветлівая і гаваркая жанчына, патлумачыла, што грошай на літаратурныя часопісы, новыя кнігі ім у апошнія гады амаль не выдзяляюць. І дазволіла мне прайсьці да стэляжоў, дзе захоўваюцца творы беларускіх пісьменьнікаў. Іх тут ня меней за тры сотні, але большасьць выдадзеная яшчэ да 1986 г. — да перабудовы. Стаяць амаль некранутыя чытачамі творы Крапівы, Броўкі, Глебкі, Кулакоўскага, Алешкі, ёсьць томікі Купалы і Коласа, Брыля, Быкава, Караткевіча, Шамякіна. Апошняму крыху пашанцавала пры жыцьці: у 2001-м сюды трапіў ягоны апошні раман. Творы Васіля Быкава, таго ж Шамякіна, як прызналася бібліятэкарка, наведнікі просяць толькі на расейскай мове. Няма выдадзеных у 90-я г. твораў Ніла Гілевіча, Рыгора Барадуліна, Генадзя Бураўкіна, Вольгі Іпатавай, Алеся Пашкевіча, Уладзімера Арлова, Уладзімера Някляева і іншых аўтараў, што ня выйшлі з Саюзу беларускіх пісьменьнікаў у новую падуладную суполку на чале зь Мікалаем Чаргінцом.

«Але нават калі б іхныя кніжкі і былі тут, то попыт чытачоў быў бы мізэрны», — так засьведчыла са скрухай у голасе бібліятэкарка.

— За дзень чалавекі тры-пяць заходзяць сюды, іх болей цікавяць дэтэктывы, фантастыка, любоўныя раманы расейскіх і замежных аўтараў. Вось і цяпер, бачыце, у чытальнай залі над падшыўкамі рэспубліканскіх расейскамоўных газэт схіліліся тры дзядулі.

Дарэчы, калі настаў дзень майго ад'езду адсюль, я аднёс на здачу томікі Янкі Брыля і Антона Алешкі і пацікавіўся, колькі чалавек бралі беларускія кнігі за дваццаць дзён. Адказ быў ашаламляльны: «Ніводнага, акрамя вас». А заезд у шпіталь — гэта 740 чалавек, каму ў большасьці ўжо за 80 гадоў, але ёсьць маладзейшыя вэтэраны — аўганцы, гастарбайтэры. Ёсьць сярод іх і былыя афіцэры, настаўнікі, мэдработнікі, дзяржчыноўнікі, трапляюцца і шараговыя калгасьнікі, рабочыя. Але ўсе яны да аднаго, а сустракаўся я з многімі тут у сваёй і суседніх палатах, размаўлялі толькі па-расейску, на мяне, калі зьвяртаўся да іх на роднай мове, глядзелі зь нейкім адчужэньнем, а то і з падазрэньнем.

Расея, а цяпер і сёньняшняя ўлада, пры дапамозе палітыкі русіфікацыі, ажыцьцявілі духоўна-этнічны генацыд беларускага народу, як слушна зазначыў нядаўна ў «Народнай волі» кампазытар Алесь Рашчынскі. І ў пакаленьня, якое прадстаўленае ў шпіталі, скрадзеная і родная мова, і нацыянальная культура. Калі ў цёплыя дні ў залі пры сталоўцы ці ў двары на лавах зьбіралася нярэдка па сотні ці болей вэтэранаў, у тым ліку і жанчын, і нехта зь менчукоў, прыхапіўшы недзе баян, пачынаў граць і сьпяваць пасьляваенныя савецкія песьні, яму падпявалі болей жанчыны. А калі я папрасіў таго жвавага баяніста-пэнсіянэра прасьпяваць хоць адну беларускую песьню, ён адказаў: «А я іх ня ведаю». Праўда, тут жа зьвярнуўся да тых, хто акружыў колам яго, з запытаньнем: «Хто зможа прасьпяваць беларускую песьню?». У адказ было маўчаньне, яго празь нейкі момант парушыла не зусім старая жанчына: «Я магу». І засьпявала песьню з рэпэртуару расейскай сьпявачкі Зыкінай! Болей ахвотнікаў не знайшлося. І гэта пры тым, што Беларусь паводле колькасьці запісаных у свой час народных песень займае, магчыма, вядучае месца сярод усіх славянскіх народаў — тут запісана звыш 20 тысяч песень!

Мне пасьля такой сустрэчы стала горка і балюча на душы. І прыгадаўся афарызм Бэртрана дэ Жувэна, францускага філёзафа: «Грамадзтва авечак зь цягам часу немінуча спародзіць уладу ваўкоў». Ці не пра нас гэта сказана?

**Міхась Кутнявецкі, Слуцак**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас:**
**а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**

# Магутная постаць Ткачова

10 сакавіка споўнілася б 65 год гісторыку й грамадзкаму дзеячу Міхасю Ткачову. Пра настаўніка піша ягоны вучань **Генадзь Семянчук.**


АРХІЎ Г. СЕМЯНЧУКА

**Міхась Ткачоў. Мітынг у Менску. Пачатак 90-х.**

31 кастрычніка споўніцца 15 гадоў з дня сьмерці гэтай унікальнай асобы. Да сёньня для шмат каго ён застаецца маральным аўтарытэтам.

Міхась Ткачоў нарадзіўся ў старажытным Мсьціславе ў сям'і настаўнікаў. Бацька Алесь загінуў у 1942 пад Ленінградам, не даведаўшыся аб нараджэньні сына. Гадавала яго маці Дамініка.

Багатая гісторыя роднага гораду, Замкавая гара, цэрквы й кляштары паўплывалі на станаўленьне асобы будучага навукоўца. Зь іншага боку, цяжкае, напаўгалоднае жыцьцё, несправядлівасьці і зьдзекі зь людзей з боку савецкіх функцыянэраў спрычыніліся да раньняга грамадзянскага сталеньня.

У 1959 г. Міхась Ткачоў паступіў на гістарычны факультэт БДУ. Ён канчаткова «захварэў» на сярэднявечную гісторыю. Але вучоба пачалася не адразу. Дзейнічаў тыповы для бальшавікоў загад: калі ня маеш двух гадоў працоўнага стажу, першы курс вучысься завочна. Будучыя інтэлігенты мусілі прайсьці пралетарска-сялянскую загартоўку. Ткачову некалькіх месяцаў стажу бракавала. Ён вяртаецца ў Мсьціслаў і напрацоўвае яго паляводам у калгасе імя Варашылава.

Адаптацыя да тагачаснага Менску таксама праходзіла балюча. Правінцыйны хлопец з рамантычнай душою ехаў у беларускую сталіцу, як у духоўны цэнтар, а яго сустрэў чужы расейскамоўны горад. Не адразу ён знайшоў там патрыятычнае асяродзьдзе. Малады Ткачоў знаёміцца з Станіславам Шушкевічам, беларускім паэтам, які нядаўна вярнуўся з ГУЛАГУ, зь Язэпам Сушынскім, паплечнікам Янкі Купалы яшчэ па суполцы «Загляне сонца і ў наша аконца». Лёс зьвязвае яго зь Мікалаем Улашчыкам. Яны сябравалі (вопыт і маладосьць) да апошніх дзён Улашчыка. Сваю кнігу «Замкі і людзі» Ткачоў прысьвяціў гэтаму выдатнаму навукоўцу. Былі сустрэчы і іншага характару. Лаўрэнці Абэцэдарскі карміў здольнага студэнта абяцанкамі асьпірантуры. А калі дайшло да справы — адмовіў.

Пасьля заканчэньня ў 1964 г. унівэрсытэту Ткачова разьмеркавалі на працу настаўнікам у Жодзіна. У 1968 г. ён паступае ў асьпірантуру пры Інстытуце гісторыі, але па спэцыяльнасьці археалёгія. Лёсам яму было наканавана стаць не кабінэтным навукоўцам, а археолягам.

Ткачоў сярод першых, ня толькі ў Беларусі, пачаў працаваць на мяжы гісторыі і археалёгіі, вывучаючы абарончае дойлідства Вялікага Княства Літоўскага.

Прафэсар праводзіў раскопкі ў Горадні і Навагрудку, Лідзе і Крэве, Міры і Геранёнах, Мядзеле і Маладэчне, Дрысьвятах і Іказьні, Браславе. У другой палове 70-х яго ўвага была скіраваная на Ўсходнюю Беларусь: Віцебск, Магілёў, Мсьціслаўе, Крычаў, Гомель, Чачэрск, Прапойск. У выніку М.Ткачоў пераканаўча паказаў высокі ўзровень абарончай сыстэмы гарадоў і мястэчак Падняпроўя і Падзьвіньня. Гэта была рэакцыя на складаныя адносіны ў XVI—XVIII ст. з суседняй Маскоўскай дзяржавай. Ткачоў змог у сваіх працах гарманічна спалучыць археалягічныя зьвесткі

**Прафэсар Ткачоў**

напісаў дзьве сотні навуковых прац, зь іх 10 кніг. Поўная бібліяграфія праф. М.Ткачова зьмешчаная ў зборніку «Castrum, urbis et bellum» (Менск, 2002). У 1972 абараніў кандыдацкую «Вайсковае дойлідства Беларусі XIII—XVIII ст. (на помніках паўночна-заходняй і паўднёва-заходняй Беларусі)». У 1987, абараніў доктарскую дысэртацыю «Арганізацыя абароны гарадоў Беларусі XIV—XVIII стст.». На падставе дысэртацый ствараліся папулярныя кнігі. Гэта «Замкі Беларусі» (1-е выд. 1977 на беларускай мове, 2-е выд. 1987 і 3-е выд. 2002 — па-расейску); «Абарончыя збудаваньні заходніх зямель Беларусі XIII—XVIII ст.» (1978); «Замкі і людзі» (1991). Кола навукоўцаў, зь якімі падтрымліваў сувязь, шырокае: у Маскве — Л.Аляксееў і В.Сядоў, у Санкт-Пецярбургу — В.Грыцкевіч, П.Рапапорт, А.Кірпічнікаў, Ф.Гурэвіч, В.Булкін; у Кіеве — А.Моця, В.Зоцанка, у Рызе — А.Цаўнэ, у Торуні — С.Александровіч.

**Генадзь Семянчук**

дацэнт катэдры археалёгіі і этналёгіі Гарадзенскага дзяржаўнага ўнівэрсытэту імя Янкі Купалы.

з паведамленьнямі гістарычных крыніц.

Гісторык, археоляг, крыніцазнаўца, геральдыст — вось няпоўны сьпіс яго талентаў. Галоўная ўвага Ткачова была скіраваная на дасьледаваньне вайсковай гісторыі.

Прафэсар Ткачоў прасачыў генэзіс і эвалюцыю разьвіцьця будаўніцтва замкаў і абарончых сыстэмаў, а таксама арганізацыю абароны беларускіх гарадоў.

Пасьля драўляных абарончых канструкцый прыходзяць з другой паловы XIII ст. мураваныя вежы-данжоны (Камянец, Горадня, Берасьце, Наваградак, Тураў) і з XIV ст. — агульнадзяржаўныя замкі-кастэлі (Ліда, Крэва, Меднікі) і шматвежавыя замкі (Горадня, Наваградак).

З канца XV і да XVII ст. інтэнсіўна будуюцца прыватныя замкі (Мір, Геранёны, Ікaзьнь, Мядзел, Любча і інш.), удасканальваецца фартыфікацыйная сыстэма гарадоў (Слуцак, Полацак, Віцебск), зьяўляюцца інкасталяваныя сьвятыні, міні-замкі (Сынкавічы, Мураванка, Супрасьля).

Зь сярэдзіны XVI ст. на захадзе Беларусі будуюцца замкі эўрапейскага тыпу з сыстэмай бастыёнаў (Нясьвіж, Заслаўе, Быхаў).

Ткачоў давёў, што вайскова-манумэнтальнае дойлідзтва Беларусі ў сярэднявечча адпавядала патрабаваньням часу. У вайскова-інжынэрным мастацтве XIV—XVIII ст. ён вылучыў дзьве галоўныя рысы: 1) сувязь зь мясцовымі традыцыямі вайсковага будаўніцтва і народнай драўлянай архітэктурай; 2) кантакты і выкарыстаньне найноўшых дасягненьняў у галіне фартыфікацыі Польшчы, Чэхіі, Нямеччыны, Нідэрляндаў і Італіі.



АРХІЎ Г. СЕМЯНЧУКА

**Ткачоў і аўтар. Ліпень 1989 г. Браслаў. Раскопкі «Замкавай гары».**

Прафэсар не пасьпеў выгадаваць сваіх асьпірантаў, фармальна стварыць сваёй школы. Аднак у яго былі вучні, неабыякавыя да сярэднявечнай гісторыі — Алег Трусаў, Лявон Калядзінскі, Тацяна Бубенька, Алесь Краўцэвіч, Ігар Чарняўскі, Генадзь Сагановіч, Андрэй Мяцельскі, аўтар гэтых радкоў.

З 1978 году лёс на доўгія 12 год зьвязаў Міхася Ткачова з Горадняй. Ён з асаблівай любасьцю ставіўся да гораду над Нёманам і шмат зрабіў для захаваньня яго гістарычнай памяці. Калі сёньня запытаць гарадзенскіх студэнтаў-гісторыкаў 1978—1989 г. пра ўражаньні ад вучобы ва ўнівэрсытэце, большасьць успомніць ткачоўскія лекцыі.

Навуковую і пэдагагічную працу М.Ткачоў спалучаў з актыўнай грамадзкай і палітычнай дзейнасьцю. У канцы 80-х ён быў лідэрам гарадзенскага гісторыка-культурнага і палітычнага клюбу «Паходня». Клюб зрабіўся цэнтрам дэмакратычнага руху гораду, гэта была ўнікальная школа патрыятызму. Як тады перапалохаліся ахоўнікі савецкае ідэі! Было арганізаванае цкаваньне «Паходні», запалохваньне студэнтаў дэканамі і рэктарамі. У 1989 г. прафэсару Ткачову прыйшлося пакінуць мілую яго сэрцу Горадню і пераехаць у Менск.

Працуючы ў рэдакцыі выдавецтва «Беларуская Энцыкляпэдыя» (спачатку кіраўніком гістарычнай рэдакцыі, а пазьней галоўным рэдактарам), Ткачоў быў ініцыятарам стварэньня фундамэнтальных энцыкляпэдый археалёгіі і нумізматыкі Беларусі, а таксама шасьцітамовай «Энцыкляпэдыя гісторыі Беларусі».

Адначасова Ткачоў абіраецца намесьнікам старшыні Сойму Народнага Фронту. Ён быў сярод арганізатараў сацыял-дэмакратычнага руху Беларусі. У сакавіку 1991 г. Ткачоў быў абраны першым старшынём Цэнтральнае Рады Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады.

Міхась Ткачоў — ня проста вялікае імя вядомага навукоўца і палітычнага дзеяча. Для большасьці людзей ён быў, у першую чаргу, добрым, уважлівым чалавекам. І палымяным патрыётам. У адным з апошніх інтэрвію ў 1992 г. на пытаньне «Што Вы лічыце сёньня галоўным у жыцьці Беларусі?» Міхась Ткачоў адказаў: «Лічу найважнейшым і неабходным кожнай



АРХІЎ Г. СЕМЯНЧУКА

**Міхась Ткачоў са Станіславам Шушкевічам. Пачатак 90-х.**

# Магутная постаць Ткачова

партыі, кожнаму чалавеку стаць «дзяржаўнікамі»: усімі сіламі і супольнымі намаганьнямі мацаваць сувэрэнітэт і незалежнасьць Бацькаўшчыны, ствараць цывілізаванае, салідарнае, дэмакратычнае грамадзтва».

Немагчыма ўявіць, каб Ткачоў-палітык зацьвярдзеў, накшталт лідэраў сучаснай апазыцыі. Складваецца ўражаньне, што, чым больш яны прайграюць, тым мацней трымаюцца за свае месцы і агрэсіўней бароняцца. М.Ткачоў, напэўна, знайшоў бы сабе месца ў камандзе Аляксандра Мілінкевіча, зь якім яго зьвязвалі шчырыя сяброўскія адносіны. Іх саюз у Горадні канца 70—80-х быў прыкладам гарманічнага спалучэньня ўсходнебеларускай інтэлігентнасьці з заходнебеларускай. Пры жыцьці Ткачова нават у чорным сьне не ўяўляўся падзел Грамады на дзьве часткі — беларускамоўную (пад кіраўніцтвам Шушкевіча) і расейскамоўную (пад началам Казуліна).


АРХІЎ Г. СЕМЯНЧУКА

**Міхась Ткачоў і вучні: аўтар (Генадзь Семянчук) стаіць зьлева, сядзіць Лявон Калядзінскі. Ліпень 1984 г. Віцебск.**

Сёньня беларуская археалягічная навука пераўтварылася ў суцэльную камэрцыю. Неабходнасьць зарабляць на разьвіцьцё прывяла да бездухоўнай канкурэнцыі дзеля ўласнага ўзбагачэньня альбо выратаваньня фінансавага становішча Інстытуту гісторыі Акадэміі навук. Задачы аховы помнікаў, вывучэньня малавядомых старонак мінулага, вырашэньня важных гуманітарных праблемаў забыліся. Памяць пра экспэдыцыі Штыхава, Лысенкі, Зьвяругі, Міхася Чарняўскага і Ткачова засталася толькі на старых фатаздымках. Быў час, быў век, была эпоха…

Актыўныя ў канцы 80-х Алег Трусаў, Ігар Чарняўскі, Алесь Краўцэвіч, Алег Дзярновіч, Валянцін Собаль, з розных прычынаў адышлі ад дасьледаваньняў сярэднявечных фартыфікацый. Сёньня толькі ініцыятыўныя студэнты намагаюцца ратаваць замкі ў Любчы і Крэве, палацы ў Ружанах і Косаве.

У адукацыі адсутнасьць маральных і навуковых аўтарытэтаў, кшталту М.Ткачова, моцна зьменшыла ўплывы гістарычных факультэтаў на культурнае і сацыяльнае жыцьцё грамадзтва. Нават спэцыялісту сёньня цяжка назваць прозьвішчы і навуковыя школы вядучых спэцыялістаў у сыстэме ўнівэрсытэцкай адукацыі…

Творы Ткачова застаюцца актуальнымі, бо яны адзіныя прасьвечаныя пэўным навуковым праблемам. Жыцьцёвы шлях Ткачова чакае свайго біёграфа.

**Для тых, хто не прызнае афіцыйны погляд на гісторыю**

**Беларускі гістарычны агляд.** Том 13. Сшытак 1 (24). Чэрвень 2006. Паказьнік тамоў I–XIII (1994—2005).

У спэцвыпуску друкуецца выключна пералік усіх артыкулаў ды рэцэнзій, што зьмяшчаліся ў незалежным гістарычным часопісе (рэдактар — Генадзь Сагановіч) цягам дванаццаці гадоў (1994—2005).

Для зручнасьці карыстальніка артыкулы зьмешчаныя па розных разьдзелах. Асобна прыводзяцца сьпісы рэцэнзаваных выданьняў (таксама ад А да Я) і аўтараў часопісу за 1994–2005 гады.

Нумар зручны для карыстаньня, асабліва тым, хто мае ня ўсе нумары «БГА».

**АГ**

## Праз 5 гадоў «Старая Горадня» магла б стаць цалкам пешаходнай


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

У Горадні створаны альтэрнатыўны праект аўтадарожных разьвязак старой часткі гораду. 12 сакавіка прадстаўнікамі грамадзкасьці ён пададзены ў Адміністрацыю прэзыдэнта.

Паводле праекта, ужо праз 5 год «Старая Горадня» мусіць стаць пешаходнаю. «Калі мы даведаліся, што гарадзенскія ўлады хочуць пракласьці «аб’язную» дарогу проста праз Стары Замак, нам нічога не заставался як пачаць распрацоўваць альтэрнатыўны праект», — кажа адзін зь яго аўтараў, гісторык Андрэй Вашкевіч.

**Паводле «Эўрарадыё»**

# Яе называлі «беларускай»

**Наста Лісіцына** была адзінай школьніцай на ўвесь савецкі Менск пачатку 80-х, якая навучалася па-беларуску. З Настай гутарыць **Сяргей Будкін**.

Пра Насту Лісіцыну мне калісьці распавёў прафэсар Лявон Баршчэўскі. Як ён сам натхніўся яшчэ ў Наваполацку яе прыкладам і таксама адстаяў права навучаньня сваёй дачкі па-беларуску. Палітык Вінцук Вячорка ведаў бацьку той школьніцы — Мікалая Лісіцына, але кантакт даўно згубіўся. Мастак Алесь Цыркуноў быў на пахаваньні маці дзяўчыны ў 1985 г., кажа, што гэта было першае пахаваньне ў Менску пад бел-чырвона-белым сьцягам. Казалі, што цяпер Наста ў Вільні. Празь сям'ю Вітушкаў дазналіся, што яна вярнулася ў Менск.

Наста пайшла ў першую клясу ў 1980 г. Як усе, у звычайную сярэднюю школу. Яе бацькі марылі, каб дачка атрымала адукацыю па-беларуску. Жаданьне на той час абсалютна нерэальнае, бо ў школах нават беларускую літаратуру выкладалі па-расейску, а ад вывучэньня мовы вызвалялі на першае ж патрабаваньне бацькоў вучня. Лісіцыны пайшлі адваротным шляхам. І Наста на пачатку 80-х стала адзінай беларускамоўнай вучаніцай на ўсю сталіцу.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Наста Лісіцына каля будынку школы, у якой вучылася.**

**«Наша Ніва»: Ці памятаеш, зь якімі перашкодамі сутыкаліся бацькі?**

**Наста Лісіцына:** Спачатку ім казалі, што няма беларускіх падручнікаў і настаўнікаў, якія добра валодаюць мовай, і што для адной вучаніцы немагчыма скласьці адмысловы расклад. Год пайшоў на пошук кнігаў, людзей, на напісаньне заяваў і абыходжаньне ўсіх магчымых інстанцыяў. У гэты час я сядзела дома, наведвала толькі агульныя ўрокі — працу, фізкультуру, маляваньне. Знайшліся паступова і настаўнікі, і падручнікі, і расклад зрабілі адмысловы. Так я і правучылася да канца школы.

**«НН»: І якім чынам праходзілі заняткі?**

**НЛ:** Разам з клясай я наведвала агульныя ўрокі кшталту фізкультуры. Асноўныя прадметы мне выкладалі асобна. Была ў клясе адна, і расклад урокаў быў складзены такім чынам, што настаўнікі маглі і ў клясах выкладаць, і мне таксама.

**«НН»: Ці хапала ў настаўнікаў ведаў, каб выкладаць тую ж матэматыку па-беларуску?**

**НЛ:** Як пачалі навучаньне, дык ведаў хапала хіба ў настаўніцы па беларускай мове. Астатнія вучыліся ра-

**Нейкія 20 гадоў** таму ў Менску адна толькі школьніца навучалася па-беларуску, а яе бацькоў лепшыя людзі лічылі за дзівакоў, а горшыя ледзьве ў Навінкі не адпраўлялі, маму давялі да труны... Цяпер маем ужо гімназіі, Беларускі ліцэй, свабодныя газэты, незалежныя выдавецтвы. І надзею маем. За гэта варта было змагацца.

зам са мной, разам тэрміны перакладалі з расейскай. Зь цягам часу стала прасьцей, беларуская — гэта ж не кітайская, ўрэшце.

**«НН»: Як ты пачувалася сярод іншых дзяцей, сяброў. Ці не дражнілі?**

**НЛ:** Давялося шмат чаго перажыць. І байкот абвяшчалі, дражнілі «беларускай». Настаўнікі тут гралі ня надта добрую ролю: яны былі пасярэднікамі між мной і астатняй клясай, але нічога не рабілі, каб залагодзіць гэты канфлікт. Прыходзіла дамоў, плакала, перажывала. Але ніколі ня думала пра тое, каб кінуць беларускамоўнае навучаньне. Адно ад аднаго не залежала. Бацькам было цяжэй, бо яны змагаліся на іншым узроўні. Дырэктарка была дэпутатам Вярхоўнага Савету, таму наша гісторыя выйшла далёка за межы школы. Пётра Краўчанка, на той час сакратар менскага гаркаму КПБ, прыходзіў да мяне ў клясу, каб спраўдзіць, ці ўсё ў мяне нармальна з галавой, ці сапраўды я магу зьвязаць два словы па-беларуску.

**«НН»: Дык што, выходзіць, улады скарыліся перад жаданьнем тваіх бацькоў?**

**НЛ:** Саступілі, але ціснулі пастаянна. Бацькоў хацелі пазбавіць правоў, у вар'ятню спрабавалі ўпекчы. Памятаю, мне гадоў 14 было. Сядзела адна ў хаце ўвечары, і тут званок у дзьверы. Пыталюся: «Хто там?» За дзьвярыма: «Насьценька, гэта дырэктар школы. Хачу з табой пагаварыць». Я і адамкнула, а там такі натоўп — і ўсе гэтыя людзі ў кватэру заходзяць (потым аказалася, што прадстаўнікі Міністэрства адукацыі). І пачалі мяне распытваць: а як урокі робіш, а хто табе дапамагае і г.д. Добра, што бацька з маці прыйшлі — павыкідалі іх з хаты.

**«НН»: Ці адчувала ты сваю нейкую непадобнасьць да іншых, абранасьць?**

**НЛ:** Дзеці пра гэта ня думаюць. Я была такая ж сама, як і ўсе: хадзіла на нагах, пісала рукамі, чытала кнігі. Нейкай вывіхнутай не пачувалася. Іншая справа, для самога савецкага ладу — гэта было чамусьці дзікунствам. Цяпер жа бацькі вучаць сваіх дзяцей у трох мовах, і ніхто ня кажа, што яны нейкія не такія. Зрэшты, і да гэтага часу ў некаторых галовах нічога не зьмянілася.

**«НН»: Калі б можна было вярнуць час, ці пагадзілася б ты на такі лёс?**

**НЛ:** Асабіста я не шкадую. Мне было значна цікавей вучыцца, чым шмат якім маім аднагодкам. Мне шкада бацькоў. Я пахавала маці ў 16 год — на яе здароўі вельмі адбілася ўся гэтая гісторыя. Калі б я ведала, што бяз гэтых змаганьняў яна пражыла б больш, зрабіла б усё, каб яна ня ўмешвалася...

Потым Наста паступіла ў Беларускі ліцэй імя Якуба Коласа. А ў 1991 г. яна зьбіралася паступаць на філялягічны факультэт БДУ. Тагачасная міністарка адукацыі Людміла Сухнат напісала ліст рэктару БДУ Капуцкаму з просьбай залічыць Насту Лісіцыну як першую выпускніцу першае беларускамоўнае клясы сталіцы на факультэт без іспытаў. Наста супакоілася і ўжо бачыла сябе студэнткай, але ў сьпісах тых, хто быў залічаны на курс, ня ўбачыла свайго прозьвішча. У рэктараце патлумачылі, што для іх усе роўныя, а міністар для іх — ня ўказ. Так Наста апынулася ў Вільні — там акурат аднавілі беларускі пэдагагічны факультэт, а Ўладзімер Колас даў ёй выдатную характарыстыку. Па сканчэньні вярнулася ў Менск. Цяпер Наста працуе ў рэклямным бізнэсе і мае трохгадовага сына. Упэўненая, што яму будзе прасьцей, чым маці, у сэнсе беларускага навучаньня.

# Праваслаўная царква адхрысьцілася ад храму ў гонар Суворава

7 сакавіка Беларуская праваслаўная царква дала афіцыйны адказ на зварот грамадзкіх дзеячоў адносна пабудовы ў Кобрыні праваслаўнага храму ў гонар Суворава.

БПЦ зазначае, што гаворка пра наданьне храму імя Суворава не вядзецца: «У Кобрыні з 2004 г. ідзе будаўніцтва храму ў гонар Нараджэньня Хрыстовага ў памяць 60-годзьдзя вызваленьня Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў. Ідэя надаць царкоўнаму будынку статус Сувораўскага храма-помніка ўзьнікла ўнутры некаторых расейскіх грамадзкіх фондаў і рухах, а затым была апублікаваная на старонках адной з расейскіх газэт».

«БПЦ ня мае ніякіх дакумэнтаў, якія б сьведчылі, што намеры і праекты, якія зьвязаныя з будаўніцтвам кобрынскага храма Нараджэньня Хрыстовага з імем А.В.Суворава, атрымалі блаславеньне царкоўнага кіраўніцтва. У сувязі з гэтым пытаньні і камэнтары па дадзенай тэме павінныя быць адрасаваныя да першакрыніцы інфармацыі, а таксама да тых грамадзкіх арганізацыяў, якія ініцыявалі і падтрымліваюць дыскусію па гэтым пытаньні», — гаворыцца ў прэс-рэлізе БПЦ.

Старшыня Рады Згуртаваньня беларусаў сьвету «Бацькаўшчына» Алена Макоўская пракамэнтавала адказ БПЦ: «Я задаволеная, што Праваслаўная царква дала адказ на наш запыт, а таксама, што яна ня мае дачыненьня да гэтых падзеяў. Цяпер чарга адказаць берасьцейскім і кобрынскім уладам. Усё гэта стала магчыма і дзякуючы нашаму звароту да Філарэта, а таксама дзякуючы актыўнасьці грамадзтва ў гэтым пытаньні».

**Зьміцер Панкавец**

## ГОД ПАЭЗІІ

### УЛАДЗІМЕР ЛОБАЧ

***

Крокі зьмераў, прыйшоў на ростані,
За гарбіну свайго пляча
Кінуў сьмела каралі восені —
Вочы рудага крумкача.

Пад нагамі бясконцасьць сыдзецца
Брудам памяці і дарог
І дрыготкія рукі ўскінуцца
Пад кашуляй шукаць абярог.

Ды ня знойдзеш. Пара дзіцячая
Зьбегла з цацкамі і гульнёй.
Сталасьць — справа яна няўдзячная,
Калі ВОЛЯ табе — бядой.

Ты ня плач. Ты бяжы пасьпешліва
У зваротны задумам бок.
Выбар — справа яна нясьмешная.
Не хвалюйся — ня кожны змог.

Пі ды еж, сьпі пад цёплай коўдраю
Пад наглядам свайго ўрача.
Толькі жах будзе ноччу зорнаю —
Вочы рудага крумкача.

# Украінскія пірамiды

Грандыёзнае сьвяцілішча эпохі бронзы ва ўкраінскім стэпе. Пра адно з самых гучных адкрыцьцяў апошніх гадоў піша археоляг **Мікола Крывальцэвіч**.



I.PODROBNOSTI.UA

**Луганскія піраміды: яўнае (фота ўнізе) і прыхаванае (уверсе, фота раскопу).**



I.PODROBNOSTI.UA

7 верасьня 2006 г. брытанская газэта «The Guardian» зьмясьціла сэнсацыйны матэрыял пад назвай «Ва Ўкраіне знайшлі піраміды бронзавага веку». Паведамленьне засноўвалася на інтэрвію зь вядомым украінскім археолягам Віктарам Клочкам. У прыватнасьці, ён заявіў, што ва ўкраінскім стэпе на Луганшчыне, пачынаючы з 2004 г., ён ладзіць раскопкі ўнікальнага культавага комплексу, які ня мае аналягаў ва Ўсходняй Эўропе. Першыя зьвесткі, якія атрымалі археолягі, дазволілі сьцьвярджаць, што грандыёзнае па сваіх маштабах і значэньні сьвяцілішча дзейнічала ўжо каля 3000 г. да н.э., г.зн. у пэрыяд раньняга бронзавага веку. У сродках масавай інфармацыі археалягічны комплекс сталі называць «луганскімі пірамідамі», «луганскім Стоўнгэнджам» і нават «Вялікай Луганскай сьцяной».

Нягледзячы на тое, што дасьледаваньні на месцы т.зв. «пірамід» Віктар Клочка пачаў яшчэ ў 2004 г. і працягваў іх пазьней у 2005 і 2006 г., пра сваё адкрыцьцё ён адважыўся афіцыйна паведаміць толькі пасьля трэцяга сэзону раскопак. Маўляў, хацеў сабраць як мага больш інфармацыі і канчаткова пераканацца ў незвычайнасьці і ўнікальнасьці адкрыцьця, усьведамленьне і асэнсаваньне якога, паводле ягонага глыбокага перакананьня, яшчэ наперадзе — пасьля шматгадовых раскопак і спэцыяльнага комплекснага вывучэньня атрыманых дадзеных. Віктар Клочка — доктар гістарычных навук, адзін з уплывовых і вядомых спэцыялістаў у галіне археалёгіі бронзавага веку Ўкраіны, прафэсар унівэрсытэту ў Гданьску.

В.Клочка вымушаны быў нават даваць тлумачэньні з нагоды некаторых гучных масмэдыйных паведамленьняў пра «піраміды» каля Луганску, якія пачалі параўноўваць з эгіпецкімі. «Яны ўнікальныя па сваёй сутнасьці», — кажа з гэтай нагоды В.Клочка.

Дарэчы, калі мяне адразу пасьля шырокага розгаласу ў прэсе папрасілі пракамэнтаваць на беларускім тэлебачаньні ўкраінскую сэнсацыю пра «піраміды», я выказаў сумнеў з нагоды верагоднасьці такога адкрыцьця, дадаючы, што гаворка, напэўна, ідзе пра адмысловыя пахавальныя збудаваньні эпохі бронзы ў стэпах.

Мяркуючы па першай абагульненай інфармацыі, археалягічны помнік, які знайшлі ўкраінскія археолягі на Луганшчыне, варта адносіць да катэгорыі старажытных сьвяцілішчаў. Гэта грандыёзны па сваіх маштабах і значэньні культавы комплекс, які на працягу тысячагодзьдзяў служыў месцам пакланеньня багам і прынясеньня ахвяр. У яго склад уваходзілі шматлікія аб'екты і збудаваньні, у тым ліку і пахавальныя…

Само сьвяцілішча разьмешчанае на адным з самых высокіх узвышшаў, што каля сяла Сьцяпаніўка Перавальскага раёну Луганскай вобласьці. Наўкол ляжыць стэп, які, дарэчы, у часы раньняга бронзавага веку нагадваў лесастэп з большай вільготнасьцю, большай разнастайнасьцю расьліннага сьвету, характэрнымі дубровамі. Гару называюць «Мэргелевай градой», якая раскінулася на плошчы амаль 1,5 кв. км і мае ўзвышша блізу 60 м.

Упершыню на «Мэргелевую граду» зьвярнуў увагу мясцовы краязнаўца і вялікі аматар археалёгіі Ўладзімер Парамонаў. Ён яшчэ ў 1976 г. знайшоў на гары курганы. Парамонаў — школьны настаўнік гісторыі ў горадзе Альчэўску. У Альчэўску ён стварыў дзіцячы гарадзкі клюб аматараў археалёгіі. На «Мэргелевую граду» Парамонаў стаў прыводзіць школьнікаў з 1995 г. Ён зьвярнуў увагу ня толькі на тутэйшыя курганныя насыпы, але і на незвычайныя каменныя пліты, часткі якіх сюд-туд вытыркаліся з узвышша. Пра свае назіраньні ён паведаміў прафэсару В.Клочку, які, дарэчы, нарадзіўся на Луганшчыне. Парамонаў і школьнікі сталіся самымі актыўнымі ўдзельнікамі раскопак, якія ў 2005 г. распачаў В.Клочка на «Мэргелевай градзе».

Пасьля папярэдняга абсьледаваньня стала зразумелым, што асноўныя збудаваньні неабходна шукаць на вяршыні «Мэргелевай грады». Тут на плошчы блізу 1,3 кв. км праглядаліся сьляды каменных канструкцыяў, курганоў, а таксама «дарог» і «прамянёў» з пліт.

Раскопкі пакуль ладзілі толькі на невялікай пляцоўцы вяршыні гары.

У цэнтры ляжалі каменныя пліты, якія ўтваралі кругі правільнай формы. Там жа, хутчэй за ўсё, знаходзіўся ахвярнік і месца пахаваньняў. Пра гэта сьведчаць ня толькі некаторыя назіраньні за асаблівасьцямі канструкцыі пляцоўкі, але і знойдзены там керамічны посуд і, што таксама вельмі важна, чалавечыя парэшткі.

Культава-пахавальны комплекс складаўся з чатырох вялікіх каменных узвышэньняў — курганоў. З усходняга боку на гару, да цэнтральнай пляцоўкі, напэўна, вяла дарога, якую старажытныя людзі выкладалі каменнымі плітамі. Ніжэй пляцоўкі, на схіле праглядаюцца рэшткі іншых каменных пліт (сьляды вонкавай сьцяны?).

Геалягічныя дасьледаваньні, якія зладзілі тут спэцыялісты з Данбаскага ўнівэрсытэту, дазволілі пераканацца ў тым, што пад прынесенымі на гару плітамі ляжыць звычайны і натуральны пясчанік. Для пабудовы людзі выкарыстоўвалі вапняковыя каменныя пліты, якія неабходна было ўсьцягваць на вяршыню «Мэргелевай грады». Вапняк залягае па-за межамі ўзвышша, таму будаўнічы матэрыял даводзілася нарыхтоўваць наводдаль ад сьвяцілішча.

Старажытныя людзі спачатку высякалі глыбы вапняку, абчэсвалі іх, прыдаючы каменю выгляд пляскатай пліты каля 2 м удоўжкі і таўшчынёй 25—30 см. Кожны такі маналіт важыў блізу 2 тон! Зацягнуўшы на гару, пліты шчыльна падганялі адна да другой.

Назіраньні за канструкцыямі дазволілі раскрыць некаторыя будаўнічыя сакрэты людзей эпохі бронзы. У прыватнасьці, каменныя пліты ўкладвалі ў некалькі шэрагаў. Для гэтага на гары спачатку здымаўся дзірвановы пласт, а вызваленая паверхня залівалася адмысловым «бэтонам» — сумесьсю каменнага друзу і гліны. На створаную такім чынам «падушку» ўсьцягваліся пліты. Яны яшчэ раз пакрываліся «бэтонам» і другім пластом пліт. Шлях, які ўшыркі дасягаў 3 м, складаўся з каменных пліт. Паабал цягнулася сьцяна з маналітаў…

Сваім узростам адкрыты ўкраінскімі археолягамі культавы комплекс пераўзыходзіць нават самую старую эгіпецкую піраміду. Нагадаю, што першая каменная піраміда зьявілася ў часы III дынастыі фараонаў, г.зн. каля 2700 г. да н.э. Толькі ў сярэдзіне III тысячагодзьдзя да н.э., ці інакш — праз 500 год пасьля пабудовы комплексу на Луганшчыне, пачалося ўзьвядзеньне Стоўнгэнджу на Брытанскіх астравах.

Будаўніцтва сьвяцілішча такіх маштабаў маглі зьдзейсьніць прадстаўнікі высокаарганізаванай супольнасьці. В.Клочка мяркуе, што комплекс служыў у якасьці грандыёзнага культавага аб’екту на працягу многіх соцень гадоў. Адно з асноўных прызначэньняў комплексу — пакланеньне асноўнаму боству таго часу — Сонцу. Напэўна, да яго скіроўвалі людзі на высокай гары свае малітвы і рытуальныя дзеяньні, прыносячы яму ахвяры і дары.

Украінскія дасьледчыкі схіляюцца да думкі пра індаэўрапейскае паходжаньне супольнасьцяў, якія ў той час расьсяліліся ў стэпах. Найбольш імаверна, што яны маглі быць прышлымі індаіранцамі — легендарнымі арыямі. Археалягічныя дасьледаваньні дазваляюць вылучаць тут курганы і паселішчы спачатку ямавай, а пазьней т.зв. катакомбавай культур. Гэта былі напаўкачавыя жыхары стэпаў, якія займаліся разьвядзеньнем жывёлы, пасьвілі свае шматлікія статкі ўздоўж рэк. Вывучэньне тысячаў курганных пахаваньняў катакомбавай культуры дазваляе меркаваць, што яе носьбіты жылі ва ўмовах нестабільнай ваенна-палітычнай сытуацыі. Вышэйшыя слаі насельніцтва валодалі, акрамя ўсяго іншага, спэцыфічнымі элітнымі відамі і наборамі зброі, у тым ліку і калясьніцамі. На этапе найбольшага ўздыму ў іх узьніклі аб’яднаньні розных сацыяльных утварэньняў, якія кіраваліся з цэнтру, дзе канцэнтраваўся набілітэт. На яго карысьць працавала вялікая частка рамесьнікаў.

Паводле вынікаў самых апошніх дасьледаваньняў, асобныя навукоўцы схіляюцца да той думкі, што ў асяродзьдзі носьбітаў катакомбавай культуры аформіўся адмысловы варыянт грамадзка-палітычнай структуры, якая нагадвала «раньнія комплексныя грамадзтвы» — «правадырствы», «уладу цара» з дастаткова выразна вылучанымі элементамі дзяржаўнага ўпарадкаваньня.

І нават калі прыняць да ўвагі той факт, што стэпавыя супольнасьці эпохі бронзы ўжо ў III тысячагодзьдзі да н.э. знаходзіліся на вельмі высокім узроўні сацыяльнай упарадкаванасьці, нельга не дзівіцца таму, якой ступені арганізацыі трэба было дасягнуць, каб мець здольнасьць ствараць культавыя комплексы кшталту «Мэргелевай грады». Віктар Клочка, разважаючы пра сацыяльныя выток луганскага фэномэну, прызнаецца, што нават для «катакомбавікаў», якімі мы іх цяпер уяўляем, такое будаўніцтва было б занадта грандыёзным. «У сувязі з гэтым, — працягвае ён, — давядзецца пераглядаць распрацаваныя раней канцэпцыі сацыяльнага разьвіцьця грамадзтва пэрыяду бронзы ва ўкраінскіх стэпах».

Аднак неабходна мець на ўвазе, што археалягічнае вывучэньне «Мэргелевай грады» толькі пачалося, а значыць, наступныя этапы яе дасьледаваньня прынясуць шмат новай і, будзем спадзявацца, нечаканай інфармацыі для роздуму.

Нягледзячы на тое, што археалягічныя дасьледаваньні на тэрыторыі сьвяцілішча далёкія ад свайго завяршэньня, на ўрадавым узроўні рыхтуюцца рашэньні аб стварэньні на Луганшчыне археалягічнага нацыянальнага парку. Для музэефікацыі культавага комплексу на «Мэргелевай градзе» плянуецца прыцягнуць сродкі ЮНЭСКО. Статус археалягічнага парку дазваляе ня толькі належным чынам ахоўваць і комплексна вывучаць мясцовыя археалягічныя помнікі, і ў першую чаргу «Мэргелевую граду», але і разьвіваць тут неабходную турыстычную інфраструктуру. На прыкладзе эўрапейскіх археалягічных паркаў украінскія археолягі спадзяюцца таксама на прыток валанцёраў, якія возьмуць актыўны ўдзел у археалягічных раскопках на «Мэргелевай градзе».

# Галубцы



WWW.MARIONS-KOCHBUCH.DE

**Часам здаецца, што гістарычная навука ўжо ўсё адкрыла і ў мінулым няма больш таямніцаў, так што інтарэс публікі можна падтрымаць толькі фальсыфікацыямі ў духу Фаменкі або Ермаловіча. Але насамрэч і рэальных таямніцаў, загадак, рэбусаў у гісторыі безьліч. І беларуская гістарычная навука не выключэньне. Піша Алесь Белы.**

Бракуе толькі кваліфікаваных дасьледчыкаў, якія бачаць маштабную панараму задач і могуць даць ім рады. Нават такая банальная загадка: куды зьнікаюць штогод сотні выпускнікоў беларускіх гістфакаў, чым яны займаюцца ў сваіх нябачных элізэях, эмпірыях ды выраях — і тое ня мае пакуль відавочнага адказу. Што ўжо тады казаць пра гісторыю кулінарных рэаліяў? Напрыклад, пра галубцы.

Многія сучасныя расейскія кулінарныя сайты пішуць, што ўпершыню галубцы з капусты і сьвініны згадваюцца ў літаратуры ў камэдыі Арыстафана «Ахарняне» (425 г. да Н.Х.), але гэта, на жаль, «вутка», звычайная ў журналістыцы і надзвычай цяжкая ў выкараненьні, асабліва ў век Інтэрнэту. Ну няма ў Арыстафана нічога падобнага, але каму гэта цяпер давядзеш? Так і будзе гуляць гэтая *народная гісторыя* з сайту на сайт, пакуль аднойчы нейкі акадэмічны гісторык, замест таго каб зірнуць у кніжку, не зафіксуе яе як неаспрэчны факт. Ды й клясычнае расейска-савецкае вызначэньне галубцоў: *страва з капуснага лісьця, бляншаванага ў кіпені, начыненага мясным фаршам з адвараным да напаўгатоўнасьці рысам, тушыцца ў соўсе* — не зусім стасуецца зь беларускімі гістарычнымі рэаліямі.

Рыс — даволі позьняе запазычаньне ў беларускую кухню (XVII ст.), прытым яшчэ вельмі доўгі час настолькі рэдкі і дарагі прадукт, што наўрад ці нават сярэдняй заможнасьці шляхта яшчэ і ў XIX ст. магла сабе дазволіць ужываць яго на галубцы. На месцы цяперашняга рысу ўжывалася бляншаваная грубая ячневая крупа (*груца*) або грэчка, з дадаткам пасіраванай цыбулі, грыбоў і закрасаў. Таксама і мясны фарш ды стравы зь яго — зьява для нашай кухні адносна новая, з другой паловы XIX ст. Мяса даўней не прапускалася праз «машынку» (мясарубку), якіх проста не было, а рэзалася на невялікія кубікі нажом уручную. І нарэшце, неабавязкова галубцы робяцца з капусты, замест яе даўней выкарыстоўвалася і іншая зеляніна, напрыклад, лісьце хрэну.

Хто толькі не прэтэндуе на вынаходніцтва галубцоў. Напрыклад, Тахір Амірасланаў, гендырэктар Цэнтру азэрбайджанскай нацыянальнай кулінарыі, з тыпова каўкаскай шчырасьцю й эмацыйнасьцю пераконвае ўсіх былых савецкіх суайчыньнікаў, што капусныя галубцы — гэта спрадвечная азэрбайджанская страва, якая разьвілася з далмы — галубцоў зь вінаграднага лісьця. Як быццам толькі адным азэрбайджанцам тая далма і вядомая. Але ў цэлым гісторыкі кулінарыі згодныя з тым, што ў краіны нашага рэгіёну — Беларусь, Польшчу, Славаччыну, Літву, Расею — галубцы прыйшлі з Украіны.

Напрыклад, самыя славутыя польскія галубцы, «пілзьненскія», якія на пачатку 2007 г. атрымалі сэртыфікат тамтэйшага міністэрства сельскай гаспадаркі як унікальная мясцовая страва, рэцэпт якой перадаецца з пакаленьня ў пакаленьне, паходзяць зь мястэчка Пілзна Падкарпацкага ваяводзтва, што на самай мяжы з Украінай. Самі ўкраінцы былі амаль дашчэнту выселеныя адтуль у 1947 г. падчас апэрацыі «Вісла», а вось іх традыцыйныя галубцы засталіся і сталі агульнапольскім эталёнам. (Можа, гэта такі дасьціпны спосаб адзначыць 60-гадовы юбілей?).

На пытаньне, якую страву прыгатавалі б дома гасьцям-іншаземцам, кіеўцы найчасьцей адказваюць: боршч, варэнікі і галубцы. (На якое месца паставілі б галубцы беларусы, і як увогуле выглядала б прызавая тройка?). Таксама і назва стравы, хутчэй за ўсё, украінская. Ад украінскага *голубці*, як лічыцца, паходзяць і польскія *gołąbki* і славацкія *holubce*. Але што азначае назва, дакладна ня ведае ніхто. Этымалягічныя слоўнікі не даюць наконт гэтага ніякіх уцямных тлумачэньняў.

Ані форма, ані якія іншыя ўласьцівасьці галубцоў не нагадваюць галубоў. А можа, маецца на ўвазе ня птушка, а рачэй пяшчотны зварот? Па-літоўску галубцы balandėliai, таксама ад balandėlis — «галубок». Можа, даволі працаёмісты працэс вырабу галубцоў прымушаў ставіцца да іх са своеасаблівай пяшчотай, інакш адкуль гэты іранічна-эратычны эпітэт? Пытаньне застаецца адкрытым.

Наўрад ці Ўкраіну можна лічыць прарадзімай гэтай сьціплай, але па-свойму высакароднай стравы. Нягледзячы на «вутку» з камэдыяй Арыстафана, старажытнагрэцкая вэрсія выглядае найбольш верагоднай. Блізкасьць нашых паўднёвых суседзяў-украінцаў да Міжземнамор'я, адкуль на працягу тысячагодзьдзяў прыходзіла да нас усялякая новая садавіна, прымушае западозрыць, што прататып галубцоў прыйшоў да ўсходніх славянаў разам з хрысьціянствам на мяжы І і ІІ тысячагодзьдзяў зь Бізантыі. Праўда, у Міжземнамор'і больш распаўсюджаная далма, але і галубцы з капусты ня рэдкасьць. Сучасныя грэкі называюць іх *dolmadakia* або *lahanodolmathes*. Немцы называюць галубцы *kohlrouladen*, ангельцы — *cabbage rolls*, але гэтыя стэрэатыпныя назвы выдаюць абыякавасьць, непрапісанасьць гэтых чужынскіх страў у іх кухнях. Швэдзкая назва — *keldolmar* («далма з капусты»). І існуе паданьне, што ў Швэцыю іх завезла сьвіта Карла XII, які пасьля паразы пад Палтавай бавіў час у Турэччыне.

Беларускія рэстаратары галубцоў не шануюць. Падаюць іх амаль толькі ў забягалаўках, работніцкіх сталоўках. Так

шмат, як на ролах, сушы, сашымі, на іх, мусіць, ня «ўздымеш». Прынамсі, цяпер, калі ані нашы госьці, ані самі беларусы, нашай гісторыі і культуры не шануюць. Хоць сам «фармат» галубцоў лёгка надаецца да розных варыяцый з інгрэдыентамі, сярод якіх здаўна былі і традыцыйныя кампанэнты многіх страў беларускалітоўскай кухні — сьвініна, грэчка, грыбы, тварог, рыба і, канечне, бульба. Або, напрыклад, сьлівавае варэньне — у чым, зрэшты, відаць ужо ўплыў вытанчанай габрэйскай кухні.

Хуткія або «лянівыя» галубцы не начыняюць, а робяць з нашаткаванага капуснага лісьця, зьмяшанага з фаршам. Адзін з пададзеных ніжэй «лянівых» рэцэптаў, які паходзіць з Падляшша, цікавы, тыпова «крэсовы», падае лянівы галубец з грэчкі і грыбоў — менавіта галуб*ец*, а не галуб*цы*. Бо гэта фактычна запяканка, але кампанэнты тыя самыя, што і ў шырока вядомых лянівых галубцоў. Адным са «спэцыялітэтаў» беларускай і літоўскай кухні лічаць — прынамсі, у літаратуры — фаршыраваную капусту, страву, роднасную галубцам. Фарш у гэтым выпадку ўкладаецца не на асобныя капусныя лісты, а паміж лістамі ў качане — цэлым, або разрэзаным на чвэрткі. Шкада, што гэтая экзатычная для заходніх гурманаў страва не «раскручаная», не міталягізаваная ў Беларусі. Бо падобная страва ў вугорскай кухні карыстаецца ўсёй належнай пашанай. Але варта падаць да такіх «банальных» рэчаў, як фаршыраваная капуста ды галубцы, *соўс* з волі, самапавагі, уявы і вынаходлівасьці — і пераканаецеся, што «банальныя» стравы смакуюць вам зусім інакш. Паспрабуйце.

### Галубцы хуткія

*4 порцыі*

*500 г сьвежай капусты, 2 ст. лыжкі рысу, 300 г ялавічнага фаршу, 1 цыбуліна, 3 ст. лыжкі топленага масла, 4 ст. лыжкі паніровачных сухароў, 1½ шклянкі рэдкай сьмятаны, ½ шклянкі тамату-пюрэ, соль, перац паводле смаку.*

Сьвежую капусту нашаткаваць, зьмяшаць зь мясным фаршам, скрышанай і абсмажанай цыбуляй, адвараным да напаўгатоўнасьці рысам, сольлю і перцам. З атрыманай масы сфармаваць галубцы авальнай формы, укачаць іх у сухары, абсмажыць.

Скласьці галубцы ў гусятніцу або падобнае начыньне, заліць сьмятанай, зьмяшанай з таматам-пюрэ, і тушыць да гатоўнасьці.

### Галубцы з бульбай

*4—5 порцыяў*

*800 г капусты, 400 г бульбы, 1 яйка, 2 цыбуліны, 3 ст. лыжкі топленага масла, 1½ шклянкі рэдкай сьмятаны, ½ шклянкі тамату-пюрэ, соль паводле смаку.*

Качан капусты, зь якога выразана храпка, апусьціць у падсоленую ваду, якая кіпіць, паварыць 3—5 хвілін, выняць, аддзяліць лісты, зрэзаць патаўшчэньні. Вараную бульбу патаўчы, дадаць нашаткаваную падсмажаную цыбулю, дробна пасечанае варанае яйка, соль, перамяшаць. На кожны ліст пакласьці падрыхтаваны фарш, загарнуць як капэрту. Галубцы абсмажыць, скласьці на бляху, заліць сьмятанай, зьмяшанай з таматам-пюрэ, і тушыць 30—40 хвілін.

### Галубцы «крэсовыя» з грэцкай кашай і тварагом

*4—6 порцыяў*

*Качан капусты, 2—3 лыжкі тамату-пюрэ, шклянка булёну, 2 «бабкі» (ляўровыя лісткі), 1 лыжка масла, 1½ шклянкі гатовай сыпчастай грэцкай кашы, цыбуліна, 200 г тлустага тварагу, лыжачка цёртага маярану (або мацярдушкі), панюшка перцу, панюшка цукру, соль паводле смаку.*

Абраць верхняе лісьце капусты, выразаць храпку, абдаць кіпенем, потым халоднай вадой. Разьдзяліць лісьце, з кожнага зьняць агрубелы атожылак. Дробна пакрышаную цыбулю падсмажыць на топленым масьле. Тварог прапусьціць праз мясарубку, дадаць смажаную цыбулю, кашу, спэцыі, соль і цукар. Накласьці фарш порцыямі на падрыхтаваныя капусныя лісты, згарнуць галубцы. Дно плоскага рондля нашмараваць маслам, выкласьці капусным лісьцем, скласьці галубцы, заліць булёнам, накрыць, тушыць на малым агні. Праз 30 хвілін даліць 2–3 лыжкі тамату-пюрэ, разбаўленыя такой самай колькасьцю булёну. Дадаць па панюшцы цукру і перцу, ляўровае лісьце, патрэсьці рондлем, тушыць яшчэ 15—18 хвілін.

### Лянівы «галубец-запяканка» з Падляшша

*4—6 порцыяў*

*1 вялікі качан капусты, 250 г грэцкіх круп, 150 г сьвініны на скваркі, 70 г сушаных грыбоў, 2 цыбулі, 1 яйка, соль, перац.*

Абраць верхняе лісьце капусты, выразаць храпку, укласьці ў гаршчок з пасоленым кіпенем, накрыць вечкам і варыць на малым агні 15 хвілін. Адцадзіць і астудзіць. Разьдзяліць лісьце, з кожнага зьняць агрубелы атожылак. Прыгатаваць фарш. Старанна прамыць сушаныя грыбы і намачыць у вадзе пакаёвай тэмпэратуры (каля 1 л) каля 3–4 гадзін, каб добра набрынялі. Працадзіць ваду скрозь марлю і захаваць, грыбы прамыць яшчэ раз, пакрышыць, гатаваць у вадзе, у якой замочвалі, каля 1–1,5 гадзін. Булён захаваць. Кашу прыгатаваць у пасоленай вадзе (каля 0,5 л вады, 1,5 лыжачкі солі), крыху падпражыць у сухой патэльні. Сьвініну засмажыць на скваркі, дадаць пакрышаную цыбулю, засмажыць. Зьмяшаць кашу са скваркамі і цыбуляй, дадаць пакрышаныя грыбы, соль, перац, убіць сырое яйка. Выкладаць у посуд для запяканьня (напр., у гусятніцы) пластамі: лісьце капусты, фарш, ізноў лісьце капусты і г.д., накрыць усё капусным лісьцем. Заліць грыбным булёнам. Запякаць у духоўцы пры 170°С 1 гадзіну. Нарэзаць на парцыйныя кавалкі, кожны паліць топленым салам са скваркамі або сьмятанай. Падаваць з халодным півам.

### Галубцы літвінскія з чвэртак качана

*1 качан капусты (каля 1 кг), 10 шт сушаных грыбоў, 1 цыбуліна, 100 г сьвінога фаршу, 2 яйкі, ½ шклянкі ячных круп (буйных), 50 г сала, ½ шклянкі сьмятаны, соль.*

Качан разрэзаць на 4 часткі, адварыць да напаўгатоўнасьці ў падсоленай вадзе, адцісьнуць. Адвараныя ячныя крупы абсмажыць на сьвіным сале. Грыбы зварыць, нарэзаць саломкай, падсмажыць разам з нашаткаванай цыбуляй на сале. Падрыхтаваныя крупы і грыбы перамяшаць са сьвіным фаршам, сольлю і ўзьбітымі яйкамі. Атрыманай масай начыніць прамежкі паміж лістамі капусты, часткі качана перавязаць, заліць грыбным адварам і сьмятанай і тушыць пад накрыўкай.



WWW.LAURENSVEGANJOURNAL.ORG

# Дні лятуць. Песьні з-за кратаў.




**Сяргей Новік-Пяюн, БМА-груп, 2007.**

Сваім голасам Новік дае форы некаторым выканаўцам-удзельнікам праекту.

Песьні на вершы паэта, што перажыў усе тры акупацыі Беларусі, нацярпеўся ад саветаў, палякаў ды немцаў і дажыў да нашых дзён, убачыўшы першыя дні Незалежнасьці. Гэта працяг сэрыі «Беларускі музычны архіў», дзе ўжо выйшлі дыскі, прысьвечаныя Манюшку, Геніюш, Забэйду-Суміцкаму. Раней самай вядомай песьняй Новіка была, бясспрэчна, «Зорачкі». Гэты праект можа даць сьвету яшчэ колькі гітоў. Для каго бліжэй аўтарская песьня — Тацяна Беланогая прапануе сваё прачытаньне «Над калыскай» і «Ночкі». Хто хіліцца ў бок мяккага гітарнага гучаньня — праект «Бава» з кранальнай «Праз акіян». Клясычную музычную плынь прэзэнтуе тут Ларыса Сімаковіч з той жа «Калыханкай», а рок-андэргraўнд — «Голая манашка» («Павязаным» — супэр!). А ёсьць жа яшчэ рэп «Матуля мая!» ад «Чырвоным па белым». Пры ўсёй рознасьці ў стылях, тэхніцы, запісу дыск слухаецца на дзіва гарманічна. Тую гармонію толькі падкрэсьлівае голас самога паэта з уцалелых магнітафонных стужак: між песьнямі раз-пораз ён чытае свае вершы, а пры канцы бонусам зьмяшчаюцца песьні, сьпяваныя Сяргеем Новікам. Сваім голасам ён дае форы некаторым выканаўцам-удзельнікам праекту:) У такім своеасаблівым трыб'юце практычна няма надта гучных імёнаў, таму дыск цікавы ўдубальт, бо можна пазнаёміцца яшчэ і з такімі выканаўцамі, як «Водгук-квартэт», «Ростра», Інэса Леаданская ды інш. Сваімі песьнямі ўпрыгожылі праект Данчык, Шалкевіч, Вайханскі і P.L.A.N. Зь відавочных правалаў — малавядомы гурт «Jus Gladii» і ягоная малаўцямная спроба запісаць «Ночку» па мэтале зусім без уяўленьня.

Дыск — для ўсіх калекцыянэраў сучаснай беларускай музыкі і паэзіі.

# Сьвята вялікіх дажджоў




**Юры Несьцярэнка, Ковчег, 2007.**

Гэта музыка ад душы і для душы.

Першы беларускамоўны альбом вэтэрана магілёўскага року, які жыве ў Бялынічах. За два дзясяткі гадоў у рок-н-роле гэты чалавек ня страціў надзеі, не згубіў цярплівасьці, ня сьпіўся. Раней «Не стары бэнд» і яшчэ адзін праект Несьцярэнкі «White Night Blues» гралі блюзавыя стандарты і песенькі ў жанры «рускі рок». Але гадоў ужо сем як бялыніцкі блюзмэн нібы прачнуўся — пачаў ладзіць у невялікім гарадку рок-канцэрты, літаратурныя вечарыны і ўзяўся за запіс свайго беларускамоўнага альбому.

«Сьвята вялікіх дажджоў» — гэта тое, што называюць музыкай, зробленай ад душы і для душы. Несьцярэнка — прыхільнік старога добрага гітарнага року а-ля Гэры Мур і Ўладзімер Кузьмін. Такога кшталту музыка, толькі перанесеная на беларускую глебу, і гучыць на дыску.

Тэксты для альбому Юры пісаў сам, сёе-тое ўзяў зь перакладаў Баляслава Лесьмяна, магілёўскіх паэтаў і нават Людмілы Рублеўскай.

З маленькіх цудаў альбому — аднайменная назьве плыты — «Сьвята...» — 8-хвілінная баляда, у якую ўкладаецца ўвесь унутраны сьвет музыкі. Выдатны беларускі блюз — «Знаю столькі пяшчотаў» і дуэт з Варашкевічам — «Блюз белай ночы», які калі-небудзь стане гімнам Бялынічаў, якія мясцовыя інтэлектуалы называюць White Night City.

Ёсьць тут адмысловы бонус-блёк — пара твораў з саўндтрэку да спэктаклю «Песьні ваўка» са справядлівай прэтэнзіяй на жанр «рок-опэра».

Варта зазначыць, што ў запісе паўдзельнічалі такія знаныя асобы, як Алег Хаменка («Палац»), Ігар Варашкевіч і Сяргей Трухановіч («Крама»), Кастусь Канцавы («Osimira»). Для тых, хто любіць музыку.

# С миром




**Городская тоска, Go-records, 2006.**

Блізкасьць да Ўкраіны і посьпех земляка Сярогі надта адбіліся на творчасьці гэтай каманды.

Трэці дыск гомельскіх рэпэраў, якія сёлета здабылі на «Каранацыі» ўзнагароду «Лепшы гіп-гоп выканаўца году». Блізкасьць да Ўкраіны і посьпех земляка Сярогі адбіліся на творчасьці гэтай каманды. Яны працуюць у той самай плыні — «расейскія рэп-частушкі». І з тым жа Сярогам сьпяваюць (трэк «Господи, спасибо»).

Беларускага ў іх нічога, акрамя геаграфічнай прыналежнасьці, хоць слова «Беларусь» колькі разоў гучыць у чытанках. Як у галоўным гіце, прысьвечаным ўкраінскаму гарэлачнаму брэнду: «Белоруссия, Россия, Украина, чтоб всё решалось миром, пьют Немиров».

Удалы трэк максі-сынглу завецца «Гомель—Гановэр» — экспрэсіўная «тэма для братаньня».

У іх творах — жыцьцёвая філязофія немалой часткі беларускай моладзі. Сугучны нейк пасыл «С миром» з колішнім «Абы не было вайны». Бязглузда іх папракаць у жаданьні жыць спакойна ды шыкоўна. Дасягнуць мэты, здабудуць глямурныя выгоды — будзе супэр, ня выйдзе — падвернецца офісная праца. Выхоўваліся яны так, карцела самавыявіцца — запяялі гіп-гоп (поп, тэхна, RnB), захацелі лепшага жыцьця — напісалі пару-тройку саладжавых гітоў. І ўся творчая біяграфія... Слухаць можна з пункту гледжаньня тэхнічнага — песьні аранжаваныя і запісаныя на высокім узроўні. Музыка гучыць смачна і калярытна. Але толькі ганарыцца не выпадае. Для музычных рэдактараў беларускай FM-прасторы.




http://www.tanakaland.org

## ФЭСТ

**«Беларуская вясна» ў Кіеве**

**З 14 да 25 сакавіка** ў Кіеве адбудзецца фэст «Беларуская вясна». **14 сакавіка** ў кінаклюбе Грамадзянскай кампаніі «Пара» адбудзецца прэзэнтацыя фільму Юр'я Хашчавацкага «Плошча». **16 сакавіка** ўкраінскія актывісты маюць намер правесьці пікет ля пасольства Беларусі ў Кіеве ў падтрымку беларускай дэмакратыі. **19 сакавіка** пройдзе круглы стол, на якім будзе абмяркоўвацца стратэгія Украіны адносна Беларусі. Кульмінацыяй «фэсту» стане жартаўлівая акцыя, прызначаная на **25 сакавіка**: «спаборніцтвы па лыжным бегу на асфальце на кубак Аляксандра Лукашэнкі».

**Паводле www.charter97.org**

## КАНЦЭРТ

**Стары Ольса**

**18 сакавіка ў Віцебску ў Абласной філярмоніі** адбудзецца канцэрт гурта «Стары Ольса».

**Пачатак а 17-й.** Т.: 8-029-718-72-79

## ТЭАТРЫ

**Опэра**
*на сцэне ЦДА*
**16 (пт)** — канцэрт «Пэрліны барочнай музыкі». І.Бах «Кававая кантата»
**19 (пн)** — «Князь Ігар»

**Купалаўскі тэатар**
**16 (пт), 17 (сб)** — «Вольга»
**18 (ндз)** — «Каханьне ў стылі барока»
**19 (пн)** — «Чычыкаў»
**21 (ср)** — «Я не пакіну цябе...»
**22 (чц)** — «Таполевая завея»

**Тэатар беларускай драматургіі**
**16 (пт)** — «Адэль»
**16 (пт)** — «Разбойнік»
**17 (сб), 18 (ндз)** — «Што за цуд гэтая казка»
**17 (сб), 18 (ндз)** — «Забойства па-французку»
**18 (ндз)** — «Адвечная песьня»
**20 (аўт)** — «Ганна ў тропіках»
**21 (ср)** — «Містэр розыгрыш»
**22 (чц)** — «П'емонцкі зьвер»

**Тэатар юнага гледача**
**17 (сб)** — «Пацалунак начы»
**17 (сб)** — «Якая стварыла цуд»
**18 (ндз)** — «Неверагодныя прыгоды Мішуткі і ягоных сяроў у краіне казак»
**22 (чц)** — «Тарас на Парнасе»




## ВАРТА ПАГЛЯДЗЕЦЬ

# Кінахрыбет

Першы фільм новага тысячагодзьдзя на менскіх экранах.

**Хрыбет д'ябла** (El Espinazo Del Diablo)

Гішпанія — Мэксіка, 2001, каляровы, 106 хв.

**Рэжысэр:** Гільерма Дэль Тора

**Жанр:** Гісторыка-містычная драма-прыпавесьць

**Адзнака:** 10 (з 10)

30-я гады. Грамадзянская вайна ў Гішпаніі. 12-гадовы Карлас (Фэрнарда Цьелвэ) пасьля сьмерці бацькі-камуніста трапляе ў прытулак пад апеку «чырвонай» дырэктрысы Кармэн (Марыса Парэдэс) і прафэсара Касарэса (Фэдэрыка Лупі). У школьным двары гмырыцца неразарваная авіяцыйная бомба, а ў начных калідорах блукае прывід загіблага хлопчыка…

Першая частка містыка-мэтафізычнай трылёгіі Гільерма Дэль Торы пра Грамадзянскую вайну й фашызм (другая частка – «Лябірынт Фаўна», а трэцяя — мусіць зьявіцца ў 2009 годзе).

Карціна – шэдэўр мэксыканскага рэжысэра. Фільм ня толькі распавядае пра людзкія лёсы падчас крывавае калатнечы (гісторыя ад Антоніа Трасораса) — і ня проста палохае страшнай казкай пра прывіда (прыдумка Гільерма Дэль Торы). Фільм увасабляе саму існасьць кіно.

Калісьці крытык Андрэ Базэн бараніў «анталягічную праўду» кіно і параўноўваў фільмы з бурштынам, у які трапляюць інсэкты — каб назаўжды захавацца.

Карціна «Хрыбет д'ябла» — бурштын. Але ў гэтым бурштыне не забытыя рэчы ці спакутаваныя ад старасьці твары — хаця праўда эпохі й псыхалягічная глыбіня адметныя для карціны.

На стужцы, прадусаванай Пэдра Альмадоварам, зафіксаваныя цалкам нематэрыяльныя зьявы. Страх, юр, нянавісьць і прага да грошай; людзкія забабоны, першае каханьне, мужнасьць, адказнасьць. Ініцыяцыя, калі дзіця сутыкаецца са злом і мусіць даць яму бой (невыносная сцэна, калі дзеці атакуюць ворага). Сацыяльнае зло – як праява мэтафізычнага — і прывід, як помста й акрываўленае сумленьне.

Бурштынавым алькаголем залітыя эмбрыёны-пачваркі, якіх мясцовы люд называе «хрыбтамі д'ябла»; залаты напой раскупляецца «для патэнцыі». Залаты твар у патопленага прывіда — і толькі кроплямі цурочыць кроў уверх. Да часу стаілася й маўчыць бомба, умураваная ў інтэрнацкі двор – каб выбухнуць жоўта-залатым полымем. Залатыя зьліткі ў драўлянай назе дырэктаркі-інваліда, залатыя твары забітых; бурштынавае цела палюбоўніка-падонка; залатая сьпёка дарогі, на якую выходзяць асірацелыя дзеці.

Стары прафэсар у карціне пакутліва пытаецца і ягоныя словы — пра сам фільм: «Што такое прывід?.. Трагедыя, якой наканаваны вечны паўтор?.. Мо, сэкундны боль? Нешта мёртвае, што здаецца жывым… Пачуцьце, падвешанае ў часе. Быццам фатаграфія ў расфокусе. Быццам муха ў бурштыне…

Прывід — гэта я».

Ілюзія ўвасобілася.

Карціна дэманструецца ў фармаце «4х4» з чацьвярга 15 сакавіка ў кінатэатрах «Аўрора», «Цэнтральны», «Перамога», «Мір».

Таксама ў кінафармаце «Спачуваньне спадарыні Помсьце», «Крывавы дыямант», «Як малыя дзеці».

**Андрэй Расінскі**

# калі б...



**...шэйхі Аб’яднаных Арабскіх Эміратаў адгукнуліся на яго прапанову – адпачываць у Белавескай пушчы.**

— Дзіўнае, бабуля, рэха ў пушчы. Я — «ооооў», а яно ў адказ: «аллааааааааг акбар».





**...беларусы пазычалі грошы па схеме, па якой Ён бярэ крэдыты...**

Ты, здраднік славянскай расы, алігарх, газпромаўская падсьцілка... дай тысячу да заўтра.

**...нехта зь беларусаў захацеў адпачыць на лыжна-трэніровачнай базе ў Сочы, якая фармальна належыць усім грамадзянам РБ.**

— Натуральна, Вы як беларус маеце права адпачыць у Краснай паляне. Дарэчы, а вось і ваш лыжны інструктар.



ТЭКСТ І МАЛЮНКІ ЛЁЛІКА УШКІНА

# Яе называлі «беларускай»




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Старонка 22.

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

Зь Бельскага ўезду, Гродзенскай губэрніі. У 1899 гаду па распараджэньню царкоўнага начальства, без усякай просьбы са стараны мужыкоў, аддзялілі некалькі вёсак з Чыжоўскай парафіі: Курнашава, Кэйлы, Ленева, Лушчы і Ляды, і зрабілі зь іх асобную парафію «Курнашаўскую». Мужыкі любілі і старую парафію, і старыя магілкі, гдзе адпачываюць іх блізкія і родныя, бацькі і дзеды, а затым пры ўсякай царкоўнай патрэбе хіліліся да старай парафіі.

Сем гадоў ужо клапоцяцца мужыкі, каб іх ізноў прыпісалі да старай царквы. Пісалі яны жалабы да ўсіх духоўных начальнікаў, езьдзілі да обэр-пракурора сыноду Пабеданосцава, падавалі прашэньне і цару. Усё дарма.

Калі генэрал-губэрнатар ня зважыць іх просьбы і не прыпішаць да старай царквы, то яны пяройдуць або ў каталіцтва, або ў якую-небудзь другую веру.

**Герасім Серы**

**«НН». №11. 1907**




# А ты падпішыся!

**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,** проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Адначасова Рэдакцыя зьвяртаецца з просьбай ахвяраваць на выданьне. Дэталі — **старонка 17.**

## 23 сакавіка вечарына «Нашай Нівы» ў Горадні

Запрашаем усіх гарадзенскіх чытачоў у пятніцу, 23 сакавіка, а 19.00, на вечарыну «Нашай Нівы». Гаворка пойдзе пра гарачыя тэмы нашага жыцьця. Таксама будуць прэзэнтаваныя сакавіцкі нумар часопісу «ARCHE» і новая кніга Андрэя Дынька і Андрэя Скурка «Беларусь за дзесяць падарожжаў».

Сьпявае Тацяна Беланогая.

Сустрэча адбудзецца ў грамадзкай прыёмнай АГП. (Гарадзенцы ведаюць гэтае памяшканьне — раней там месьцілася майстэрня Іваноўскага.) Гэта на вул. Будзённага 48а, уваход з двара.

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Шчыры дзякуй** сакратарыяту ТБМ за своечасовае віншаваньне з днём народзінаў. Віншую з днямі народзінаў усіх прыхільнікаў «Нашага слова», «Нашай Нівы», хто нарадзіўся ў сакавіку

### ПАДАРОЖЖА

**Зьміцер Касьпяровіч запрашае** ў падарожжа 18 сакавіка: Іўе—Суботнікі—Жамыслаў—Трабы—Гальшаны—Баруны—Крэва. Т.: 292-54-58, 622-57-20, 509-12-16, 110-19-28, 573-88-17

### СПАЧУВАНЬНІ

**Артуру Клінаву** з прычыны сьмерці ягонай маці Валянціны Цюленевай выказалі на сайце nn.by Алена Гапава, Алесь Каліта, Алесь Юркавец, Алесь Белы, Тацяна Елавая

**Магутная постаць Ткачова**

10 сакавіка споўнілася б 65 год гісторыку й грамадзкаму дзеячу Міхасю Ткачову. Пра настаўніка піша ягоны вучань Генадзь Семянчук. Старонка 19.

**Украінскія піраміды**

Грандыёзнае сьвяцілішча эпохі бронзы ва ўкраінскім стэпе. Пра гучнае адкрыцьцё апошніх гадоў піша археоляг Мікола Крывальцэвіч. Старонка 24.

**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
фотарэдактар — Арцём Лява
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102-71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2241. **Газэта выдаецца 48 разоў на год.**
Нумар падпісаны ў друк 23.00 14.03.2007.
Замова № 1454.
Рэдакцыйны адрас: Калектарная, 20а-112.